№ 19 (329) 23 траўня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднoўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Рыгор Барадулін «З запазухі»



с. 11

### Сяргей Скрабец

«Рыхтуецца нейкі рэфэрэндум».

старонка 4

### «• • •»

старонкі 12—13

### Чаго ня мелі Адам і Ева?

Крыжаванка ад Сяргея Петрыкевіча.

старонка 16

# Мы Маскве прыслалі падкрапленьне



**Кажуць, што ў адзін з самых напружаных момантаў беларуска-расейскіх адносінаў апошніх гадоў маскоўскія паліттэхнолягі атрымалі заданьне вывучыць палітычны патэнцыял найбольш вядомых асобаў беларускай дыяспары ў Расеі. Шукаўся кандыдат у пераемнікі Аляксандру Лукашэнку. Не выключалася, што адпрацаваную на Каўказе схему (апошні прыклад — выбары новым прэзыдэнтам Інгушэціі генэрала ФСБ з Масквы) давядзецца скарыстаць і ў Беларусі. Пакуль не давялося. Але выявілася, што некалькі ўраджэнцаў нашай краіны граюць не апошнюю ролю ў расейскай палітыцы. Старонкі 3—4.**

ГУЧНАЯ СПРАВА

## Бібліятэку абрабаваў юрыст

У аўторак па справе аб выкраданьні старасьвецкіх кніжак з Нацыянальнай бібліятэкі былі арыштаваныя чатыры чалавекі. Сярод іх — студэнт IV курсу аддзяленьня міжнароднага права факультэту міжнародных адносінаў БДУ, былы чэмпіён краіны па таэквандо К. зь Берасьця і ягоная жонка — непасрэдныя выкрадальнікі. Студэнт знаходзіўся ў акадэмічным адпачынку, зь якога мусіў вярнуцца ў сакавіку, але ў гэтым сэмэстры толькі пару разоў наведаўся ва ўнівэрсытэт. Што яго прымусіла пайсьці на злачынства? Магчыма, банальная неабходнасьць знайсьці грошы на навучаньне.

Аддзяленьне, дзе вучыўся арыштаваны, — прэстыжнае і нятаннае. Год навучаньня для платнікаў, прынятых без экзамэнаў, каштуе 3000 у.а. Калі пры паступленьні абітурыент трохі не дабраў балаў, ён можа вучыцца, заплаціўшы прыкладна 50% гэтай сумы за першы год, траціну яе — за другі і шостую частку — за трэці курс. Пры выдатнай пасьпяховасьці пачынаючы з 4-га курсу плата скасоўваецца. Менавіта гэтага дасягнуў К. Ён быў круглым выдатнікам, «найлепшым камандзірам» узводу на вайсковай катэдры, нядаўна ажаніўся. А ў акадэмічны адпачынак пайшоў зусім не дзеля праблемаў з вучобай. Ягоныя знаёмыя, аднак, не выключаюць, што на ім віселі запазычанасьці, у якія ён улез у першыя гады навучаньня.

Выпускнікі міжнароднага права, апроч дыплёму, атрымліваюць на ўсё жыцьцё своеасаблівы мэнталітэт. Гэта — не вясёлыя «палітычныя мастакі» з аддзяленьня міжнародных адносінаў. «Права» прымушае маладзёна сутыкнуцца зь юрыдычным морам «адчужаных формаў» сучаснага сьвету. Як выказаўся адзін студэнт-праўнік, «юрыст — гэта жрэц пустаты, гэта сутнасьць ягонай прафэсіі, і гора таму, хто зразумее гэтую сутнасьць!» К. добра разумеў сутнасьць рэчаў, бо заўжды шукаў большага.

Аднакурсьнікі К. сумняюцца ў вінаватасьці свайго таварыша. К. цікавіўся і актыўна займаўся навукай, яшчэ на першым курсе захапіўся гісторыяй дзяржавы і права Беларусі. Ён вывучаў яе пад кіраўніцтвам слыннага прафэсара Юха, а ўрэшце нават пачаў сам пісаць кнігу. Менавіта таму ці не штодня наведваў аддзел рэдкай кнігі. «Мо памылка», — спадзяюцца на факультэце. Тым ня менш, як нам паведамілі, «К. ад нядаўна больш не зьяўляецца студэнтам БДУ». Суд высьветліць ісьціну, ва ўнівэрсытэце актыўна працуюць сьледчыя КДБ.

К. і ягоным хаўрусьнікам пагражае да 15 гадоў зьняволеньня, калі віна будзе даказаная. Пад падазрэньнем аказаўся і жыхар Масквы, у якога знайшлі цалюткімі ўсе 12 выданьняў, у тым ліку інкунабулу. Мо ён і быў замоўнікам.

Кнігі ў Менск прывёз асабіста прадстаўнік МУС Беларусі ў Расеі Фарыд Канцараў. Тацяна Рошчына, кіраўніца аддзелу рэдкай кнігі, свае выданьні ўбачыць праз тыдзень. Пакуль сьведкі стагодзьдзяў «бяруць удзел» у сьледчых мерапрыемствах. Застаецца назваць сьледчых, якія менш чым за месяц вярнулі нацыянальныя каштоўнасьці ў краіну. Гэта група пад кіраўніцтвам намесьніка начальніка ўпраўленьня сьледчага камітэту МУС Віктара Лабынкі.

**СР**

## Партызаны ў К.–Фэране



**У першай палове траўня ў Францыі прайшоў фэстываль «У чаканьні Беларусі», аналягаў якому па працягласьці і па колькасьці ўдзельнікаў няма на Захадзе. Фэстываль у Клермон-Фэране складаўся зь некалькіх блёкаў (палітычнага, мастацкага, літаратурнага). Пра выставу сучаснага беларускага партызанскага мастацтва, што прайшла ў яго рамках, чытайце на старонках 14–15. На фота: Віктар Маркавец. «Сьняданак на траве».**



## Конкурс для падпісчыкаў

Рэдакцыя «Нашай Нівы» праводзіць розыгрыш каштоўных прызоў для тых, хто падпішацца на нашу газэту на 2-е паўгодзьдзе. Галоўны прыз — падарожжа на Балтыйскае мора. Дасылайце на адрас Рэдакцыі копіі сваіх падпісных абанэмэнтаў (на ўсё паўгодзьдзе). Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск.

Апошні дзень падпіскі — **20 чэрвеня**. Розыгрыш прызоў — **1 ліпеня**. Падпісны індэкс **63125**. Дык падпісвайся!

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

# Гэтая ўлада загіне ад фармалізму

19 траўня БТ залівалася ўра-патрыятычнымі рэпартажамі аб прыёме новых сяброў у піянэрскія арганізацыі. Багата казалі пра «гісторыю», «традыцыі». Маўчалі пра разнарадкі з аддзелаў адукацыі.

Раней у піянэры прымалі на дзень нараджэньня Леніна. Годнае альтэрнатывы Ільічу цяпер няма. І таму не зусім ясна, навошта гэна піянэрыя. Над праблемай запаўненьня ідэалягічнага вакууму б'ецца ўся ўладная вэртыкаль. Пакуль беспасьпяхова. Чарговым сьведчаньнем таму — выступ Юр'я Сівакова перад студэнтамі Акадэміі фізвыхаваньня. Міністар перамяжаў цытаваньне Бурачка з панэгірыкамі «братняй Расеі».

Адзіная ўцямная ідэя, якую здолелі згенэраваць лукашысты, была агучаная міністрам адукацыі Брыгадзіным у часе рэктарскае нарады ў Горадні: мэта ідэалягічнага выхаваньня моладзі — «павага да дзяржаўнай улады». Файны грунт для аб'яднаньня нацыі — *нацыі ўладапаслухмяных*. «З даўных-давён, дарагія дзеткі, галоўнай каштоўнасьцю беларускага народу была лаяльнасьць да ўлады...»

Зь іншага боку, гаек таксама занадта не закруціш. Лукашэнка — асоба культавая, аднак уласнага культу асобы ўжо ня створыць. Клімат ня той. Дзьмуць моцныя заходнія вятры, Эўразьвяз, як той цмок з казкі, пралізвае адны жалезныя дзьверы за другімі.

«Калі ня можаш мяне любіць, хоць бы рабі выгляд», — вось і ўся ўладная ідэалёгія. Не відаць бляску ў вачох новапрызначаных «важатых», аж да галоўнага піянэра краіны Аляксандра Бабіцкага. Піянэрская арганізацыя ды БПСМ гадуюць канфармістаў. Як у часы Брэжнева—Машэрава, ад фармалізму і канфармізму дранцьвеюць адзін за адным чэлесы аўтарытарнага цела: і палітычная эліта, і калгасны лад, і нават юная піянэрыя.

**Андрэй Скурко**


IREX-PROMEDIA

АСОБЫ ТЫДНЯ

**Ян Павал II** адсьвяткаваў 83-і дзень народзінаў. Ягоны пантыфікат — самы працяглы ў гісторыі.


АЛЕНА АДАМЧЫК

**Руслан Салей** у складзе «Анагайм Майты Дакз» выйшаў у фінал Кубку Стэнлі.

**Вінцэнт Солтан**, кіраўнік Валожынскай арганізацыі БНФ, 15 траўня ўрачыста запусьціў малька таўсталобіка ў Івянецкае возера. Таўсталобік (Hypophthalmichthys molitrix) есьць водарасьці — не дае возеру зарастаць.



**Аляксандар Ігнацюк**, рэдактар газэты «Вечерний Столин», стаў чарговай ахвярай крымінальнага артыкулу па «зьнявазе службовай асобы». Ягоныя выпады ў адрас **Уладзімера Пашкевіча**, старшыні Столінскага райвыканкаму, былі настолькі рэзкія, што шанцаў на перамогу ў судзе практычна няма. Беларуская асацыяцыя журналістаў у чарговы раз заклікала ўлады ўстрымацца ад крымінальнага перасьледу за журналісцкую дзейнасьць.

**Генадзь Воранаў**, кіраўнік полацкае арганізацыі АГП, узначаліў ініцыятыўную групу, што хоча кантраляваць прыватызацыю ў горадзе.

**Аляксандар Маскевіч**, прарэктар Гарадзенскага ўнівэрсытэту, адмовіўся бязвыплатна прыняць ад арганізацыі «Ратуша» ризограф. Маўляў, ГарДУ ня мае грошай на абслугоўваньне такой апаратуры.

**Адвакат Гары Паганяйла** мяркуе ўвосень дайсьці з справай зьніклых палітыкаў да Эўрапейскага суду. Зінаіда Ганчар і Ірына Красоўская падалі ў суд Цэнтральнага раёну скаргу на пракуратуру, якая спыніла справу пра выкраданьне іх мужоў. Калі там адмовяць, жанчыны пойдуць у гарадзкі, а потым у Вярхоўны суд. Калі й там справу адхіляць — паедуць у Брусэль.

**Сябры КХП-БНФ Жодзіна** ня кідаюць у нядолі аднапартыйца Анатоля Рабкаўца, аштрафаванага за ўдзел у сьвяткаваньні Дня Волі на 400 тыс. рублёў. Яны вырашылі «скінуцца» й дапамагчы бацьку траіх дзяцей разьлічыцца зь дзяржавай.

**Гульцы нацыянальных зборных па футболе і хакеі** перадалі 6200 даляраў на апэрацыю Данілу Салаўёву з Казловічаў (Случчына). У паўтарагадовага хлопчыка прыроджаны парок сэрца.


IREX-PROMEDIA

**80-гадовы мастак Леанід Шчамялёў** займеў уласную галерэю ў Менску на праспэкце Ракасоўскага. Улады гораду перадалі яму ў бестэрміновую арэнду памяшканьне былога більярднага клюбу, а ён падараваў Менску 60 карцінаў. «Гораду, а не чыноўнікам», — падкрэсьліў ён на адкрыцьці. Прычым ніводнай — з нацыянальна-вызвольнага, бел-чырвона-белага цыклу.

**Эндру Джэксан**, былы прэзыдэнт ЗША, зьменіць колер. Новы 20-даляравік зь ягонай выявай, апроч звыклага зяленага, займее яшчэ пэрсікавае ды блакітнае адценьні. Тым часам даляр упаў ужо да 1,15 за эўра.

**13-гадовая С.** з Барысава адшукалася. Яе вярнулі з Разані, з сэксуальнага рабства. Летась яе завэрбавала і прадала ў Маскву перакупнікам 20-гадовая барысаўчанка М.

**Францыска ван Альмсік**, нямецкая «плывучая сэкс-бомба», ня возьме ўдзелу ў барсэлёнскім чэмпіянаце сьвету па водных відах спорту. Афіцыйная прычына — траўма пляча. Неафіцыйная — каханак-гандбаліст, дзеля якога, пляткарыць прэса, Францыска нават стала плаваць горай.



REUTERS

# Дзявятая кляса

Пры канцы траўня нават у вэтэранаў спрацоўвае біялягічны гадзіньнік: ну ўсё, апошні званок, яшчэ год адвучыліся. Наперадзе — некалькі тыдняў сонца і сьвежага паветра. Глядзіш на шчасьлівых вольных падлеткаў — і адольвае, апроч характэрных сантымэнтаў, адно нацыянальнае пытаньне: ці гэта яна, новая Беларусь?

За дзевяць гадоў Лукашэнкі — час ад дзіцячага садка да ПТВ — школьнікі пасьпелі пабачыць і старыя савецкія кніжкі, і падручнікі з «Пагоняй», і партрэты Аляксандра Рыгоравіча ў дырэктарскім кабінэце. Сярэднестатыстычны вучань засвоіў, што Расея — наша старэйшая сястра, але ўжо ня мама, што былі такія ВКЛ і БНР, што Касьцюшка зь Міцкевічам — беларусы, а Будны, Каліноўскі, Ленін ды Машэраў змагаліся за тое, каб мы жылі сёньня ў рынкавым сацыялізьме. У выніку 14-гадовыя хлопчыкі зрываюць разьвешаныя на Дзень Перамогі чырвона-зялёныя сьцягі, ходзяць зь імі на футбол і равуць «Вперёд, Беларусь!», а такія ж дзяўчаты марацьстаць поп-зоркамі ня горш за маскоўскіх і шукаюць па крамах касмэтыку, каб «краскі» былі такія ж «блестящие», як у гурту «Сливки». Расьце пераходнае пакаленьне, зь якога беларускія ўнівэрсытэты з роўным посьпехам могуць зрабіць і генэрацыю эўрапейцаў, і шэрую правінцыю.

Такая школа.

Мы ўсе, шаноўнае спадарства, пакуль што ў школе Лукашэнкі. У дзявятай клясе. За партыямі замест партаў, з адзнакамі рэйтынгаў замест балаў, з «Народнай воляй» у ролі дзёньніка. Хочам мы таго ці не, але менавіта Лукашэнка сёньня вучыць усю краіну гісторыі, геаграфіі, мове, сельскай гаспадарцы і дэмакратыі. І мы дагэтуль інфантыльна чакаем, што аднойчы, пры канцы траўня, празьвініць апошні званок. Абвесьціць дзень выбараў, мы ўздыхнём з палёгкай. Атрымаем на рукі атэстат — вынікі галасаваньня, разьвітаемся з школьнымі сябрамі — і вось яно, вольнае жыцьцё.

Мы пакуль сапраўды яшчэ дзеці: нацыянальнаму руху ўсяго 15 гадоў. Можа быць, нас насамрэч дастала гэтае нуднае паўтарэньне, нарматывы па адцісканьні й урокі пачатковае вайсковае падрыхтоўкі. Але такое ўражаньне, што давучыцца ўсё ж давядзецца. У школе Лукашэнкі, як і ў любой іншай, пры канцы — выпускныя іспыты.

**Павал Севярынец**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

# Ракаў — у Спартакаў!

**Перайменаваньне станцыі мэтро «Ракаўскай» у «Спартовую» яшчэ не набыло законнае моцы.**

Як паведаміла «НН» Натальля Старыкава, супрацоўніца камісіі Менгарвыканкаму па справах культуры, рашэньне знаходзіцца «на ўзгадненьні». Адмысловага паседжаньня па перайменаваньні станцыі праводзіцца ня будзе: усё вырашыцца «ў рабочым парадку».

Матывы тлумачацца цьмяна. Н.Старыкава зазначыла: «Вуліца Ракаўская знаходзіцца ў раёне Нямігі, далёка ад той станцыі мэтро… А лепш папытайце ў кіраўніцтве мэтрапалітэну — гэта іхная прапанова».

Галоўны інжынэр Менскага мэтрапалітэну Мікалай Андрэеў ад датычнасьці свайго ведамства да аўтарства назвы адмовіўся: «Што нам турбавацца: гэта яшчэ ня нашая япархія. У нас спыталіся толькі, ці мы ня будзем супраць такой назвы. Мы ня супраць. А наконт аўтарства пытайцеся ў «Мэтрабудзе» ці «Мэтрапраекце» — гэта яны вырашалі». Галоўны інжынэр «Менскмэтрабуду» Эдуард Жукаў: «Гэта вырашалася на гарадзкім узроўні».

Такім чынам, адказных за перайменаваньне няма. Затое хваля абурэньня накрыла сайт Менгарвыканкаму. Прыхільнікаў перайменаваньня мала. Дый сярод тых назву «Спартовая» падтрымліваюць ня ўсе: хтось прапануе «агульнагістарычную» — імя Эўфрасіньні Полацкай, хтось — «мясцова-тапанімічную»: «Цівалі». Так называлася вёсачка, якая стаяла непадалёк. Але большасьць удзельнікаў грамадзкага абмеркаваньня стаяць за «Ракаўскую». Галяндзкія беларусы пішуць, што шукалі таго фантомнага Міхаіла Майсеевіча, ініцыятара перайменаваньня, але не знайшлі.

Хацелася б верыць, што гарадзкія ўлады выявяць дастаткова разважлівасьці, каб зноў зьвярнуцца да адмыслоўцаў і не пераназываць станцыю цапу-лапу.

**Аркадзь Шанскі**

ГЛУПСТВА, ПАНЕ ДАБРАДЗЕЮ

# «Калёнія Лукашэнкі»

Вулачка Леванеўскага, найпрыгажэйшая ў Берасьці, паўстала ў 30-х гадох XX стагодзьдзя як «калёнія Нарутовіча». Названая так у гонар першага прэзыдэнта Польшчы, яна можа быць пашкоджаная «ў гонар» першага прэзыдэнта Беларусі.

Калёнія Нарутовіча, пабудаваная для сем'яў гарадзкой адміністрацыі паводле праекту знакамітага польскага архітэктара Юльяна Лісецкага, да сёньня застаецца адным з самых утульных куточкаў гораду.

На пачатку 70-х паводле праекту берасьцейскіх архітэктараў пад кіраўніцтвам Расьціслава Шылая тут быў пабудаваны выдатны ансамбль адміністрацыі абкаму КПБ (цяпер гарвыканкам). Комплекс дасканала ўпісаны ў даўнюю пляніровачную структуру гораду. Дзякуючы праектам выдатных архітэктараў тады ня зьнікла самабытная прыгажосьць кварталу.

Цяпер тэрыторыя між будынкамі гарвыканкаму і аблвыканкаму адведзеная пад рэзыдэнцыю Лукашэнкі. Згодна з творчай задумкай новых уладаў, зона з раней пабудаванымі там гатэлямі генсакаў КПСС і Генштабу можа аказацца за высокім мураваным плотам. Калі задума даўгалёўцаў зьдзейсьніцца, найпрыгажэйшы куточак гораду зь ціхай пешаходнай вулачкаю паміж вул.Энгельса і вул.Леванеўскага будзе схаваны ад людзей.

**Ірына Лаўроўская, Берасьце**

# Мы Маскве прыслалі падкрапленьне



Анатоль Чубайс думае пра Беларусь?

Працяг са старонкі 1.

## Інтэгратары

Пераважная большасьць беларусаў, якія працуюць у расейскіх уладных структурах, — зацятыя прыхільнікі інтэграцыі Беларусі і Расеі. Уладкаваўшыся ў Маскве, гэтыя людзі разьвіталіся з рэштkамі свае беларускасьці, сталіся актыўнымі праваднікамі расейскай геапалітыкі.

Першы намесьнік старшыні Савету Фэдэрацыі Расеі — 45-гадовы беларус з палескім прозьвішчам **Гарагляд**. Ягонай першай марай была авіяцыя (ён, як і лётчык Чкалаў — Валеры Паўлавіч), але давялося стаць палітыкам. Шлях Гарагляда ў расейскую эліту быў няпростым. Ён скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут, займеў эканамічную адукацыю. Працаваў у вайскова-касьмічнай галіне, быў камсамольскім функцыянэрам, узначальваў маскоўскі гаркам. Пасьля падаўся ў турыстычны бізнэс, але ненадоўга — абралі дэпутатам у Дзяржаўную Думу. З 1994 г. ён кіруе апаратам камітэту Савету Фэдэрацыі па бюджэце і фінансавых справах. Пасьля яго прызначаюць прадстаўніком адміністрацыі Сахалінскай вобласьці ў Савеце Фэдэрацыі. Быў лідэрам парлямэнцкай групы «Фэдэрацыя», віцэ-сьпікерам палаты. У студзені 2002 г. Гарагляда прызначаюць першым намесьнікам старшыні Савету Фэдэрацыі. Палітык любіць спорт, захапляецца футболам і тэнісам.

Ня так даўно Савет Фэдэрацыі, спадзеючыся набыць падтрымку Кіраўніцтва спраў прэзыдэнта, хацеў адабраць будынак у маскоўскай мэрыі. Тады Гарагляд супакойваў грамадзкую думку, кажучы, што ня хоча пакрыўдзіць сталіцу, а імкнецца толькі «стварыць нармальныя ўмовы для арганізацыі работы верхняй палаты». Цікава, што ў гэтай сытуацыі ён апынуўся па розныя бакі «фронту» зь іншым беларусам **Францам Каўрыгам**, які ва ўрадзе Масквы кіруе камітэтам па рэфармаваньні абаронных прадпрыемстваў.

Каўрыга нарадзіўся на Маладачаншчыне, недалёка ад купалаўскай Вязынкі. Працаваў на менскім заводзе электронна-вылічальных машынаў — пачынаў сьлесарам, а скончыў гендырэктарам. З пасады дырэктара Берасьцейскага электрамэханічнага заводу быў забраны ў Маскву. Там ён хадзіў у намесьніках міністра радыёпрамысловасьці і старшыні Дзяржкампрацы СССР. У постсавецкай Расеі Ф.Каўрыга ўладкаваўся на працу ва ўрад Масквы. Адначасова з 1999-га ён узначальвае раду «фэдэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расеі», арганізацыі адназначна праўрадавай (у Расеі існуюць таксама незалежніцкія арганізацыі беларусаў). Аўтаномія Каўрыгі выступае за найхутчэйшае стварэньне саюзнай дзяржавы і ня бачыць іншай будучыні для Беларусі.



Валеры Гарагляд



Франц Каўрыга



У Жарэса Алфёрава (крайні зьлева) найлепшы сябра — былы савецкі выведнік Яўген Прымакоў (у цэнтры)



Франц Клінцэвіч

Яшчэ адным вядомым інтэгратарам-беларусам зьяўляецца 45-гадовы **Франц Клінцэвіч**, ураджэнец вёскі Крайванцы на Ашмяншчыне, дэпутат Дзяржаўнай Думы ад выбарчага блёку «Мядзьведзь», сябар фракцыі «Адзінства». У сярэдзіне 1970-х ён працаваў школьным настаўнікам крэсьленьня, працы і фізкультуры ў сваёй роднай вёсцы. Пасьля сканчэньня Сьвярдлоўскай вышэйшай вайскова-палітычнай вучэльні Клінцэвіч служыў афіцэрам-палітработнікам, меў кваліфікацыю перакладчыка з мовы дары (адна зь дзьвюх афіцыйных моваў Аўганістану). У 1986—88 знаходзіўся ў Аўганістане, даслужыўся да рангу палкоўніка, мае ўзнагароды (ад Беларусі — ордэн «Знак Пашаны»). Ф.Клінцэвіч скончыў вайскова-палітычную акадэмію імя Леніна, стаўся старшынём праўленьня Расейскага саюзу вэтэранаў Аўганістану. Цяпер наш зямляк узначальвае праўленьне Народна-патрыятычнай партыі. Зразумела, што патрыёт ён расейскі. Відавочна, мае «дах» у спэцслужбах. Апошняя яго ініцыятыва — стварэньне ў Екацярынбургу газэты для «крутых хлопцаў з сталёвымі нэрвамі» — «Русский ветеран».

«Два Францы-запрадажанцы», як з крыўдаю выказаўся пра іхную дзейнасьць актывіст беларускае незалежніцкае суполкі ў Маскве.

Навуковец **Жарэс Алфёраў**, лаўрэат Нобэлеўскай прэміі, на будучых парлямэнцкіх выбарах у Расеі будзе зноў балятавацца ад камуністаў. Алфёраў нарадзіўся ў 1930 г. у Віцебску. Віцэ-прэзыдэнт Расейскай акадэміі навук. У палітыцы вагаецца паміж прапрэзыдэнцкімі палітычнымі сіламі і левымі. 57-гадовы беларус **Мікола Біндзюкоў** з Ноўгараду ўваходзіць у кіраўніцтва КПРФ, абіраўся па яе сьпісах у склад Дзяржаўнай Думы Расеі. У Думе розных скліканьняў звычайна працуе ў камітэце па справах СНД. Акрамя таго ён філёзаф паводле адукацыі, кандыдат навук. У прапрэзыдэнцкай фракцыі «Адзінства» актыўна працуе беларус **Мікола Ботка**, філёляг паводле адукацыі. Яшчэ ён мае свой бізнэс пад Гатчынай — кіруе Прамыслова-будаўнічай групай «БіК».

## Алігархі

Ня менш за названых палітыкаў вядомыя «алігархі». У лютым 2003 г. амэрыканскі штотыднёвік «Форбс» надрукаваў сьпіс мільярдэраў сьвету з 476 асобаў. Патрапіў у іх лік і расейскі беларус **Алег Дзерыпаска** (1,5 млрд. даляраў), які сярод мільярдэраў Расеі займае 7-е месца. 35-гадовы Алег зьяўляецца прэзыдэнтам Расейскага нацыянальнага камітэту Міжнароднай гандлёвай палаты. Грошы ён пачаў зарабляць яшчэ ў студэнцкія гады, калі вучыўся на фізфаку МДУ (вядомы факт: нейкай дзяржаўнай кампаніі прадаў дзясяткі тонаў цукру). Тады ж Дзерыпаска працаваў фінансавым дырэктарам мітычнага ТАА «Вайскова фінансава-інвэстыцыйная кампанія», брокерам на біржы. У 26 гадоў ён стаў дырэктарам Саянскага алюміневага заводу, заснаваў інвэстыцыйна-прамысловую групу «Сібірскі алюмін». У склад апошняй уваходзяць два дзясяткі заводаў у Расеі, Арменіі і ва Ўкраіне. У 2000 г. Дзерыпаска ачоліў кампанію «Расейскі алюмін». З гэтага часу беларуса Дзерыпаску пачалі называць «алюміневым каралём» Расеі. У 2001 г. А.Дзерыпаска ажаніўся з дачкой былога кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі Валянціна Юмашава Палінай. Палітыкай Дзерыпаска займаецца пакуль толькі ў якасьці спонсара праўрадавых палітычных сілаў.

Сярод алігархаў — ураджэнцаў Беларусі найбольш вядомы **Анатоль Чубайс**. Ён з Барысава — нарадзіўся там у 1955 г. у сям'і вайскоўца. Паводле адукацыі інжынэр, у 1982—90 г. — дацэнт Ленінградзкага інжынэрна-эканамічнага інстытуту.

Чубайсаў «зорны пэрыяд» пачаўся пасьля таго, як ён зрабіўся эканамічным дарадцам мэра Ленінграду Анатоля Сабчака. У 1991 г. Чубайс робіцца старшынём Дзяржкамітэту Расейскай Фэдэрацыі па кіраваньні дзяржаўнай маёмасьцю. Пад ягоным кіраўніцтвам распрацоўвалася праграма прыватызацыі. А.Чубайс працаваў намесьнікам прэм'ера Расеі, міністрам фінансаў, старшынём праўленьня РАТ «АЭС Расеі», цяпер — член рады дырэктараў. Зь ліпеня 2000 г. ён — прэзыдэнт Электраэнэргетычнае рады СНД, сябар праўленьня Расейскае рады прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. Анатоль Чубайс — сустаршыня партыі «Саюз правых сілаў». Мае імідж «непатапляльнага» палітыка. Нягледзячы на ўсе энэргапраблемы і нянавісьць да яго простых расейцаў, алігарх паранейшаму ля стырна.



Алег Дзерыпаска — самы багаты беларус у сьвеце



Калісьці Аркадзь Вольскі быў чэмпіёнам Беларусі па боксе

Варта таксама згадаць і **Аркадзя Вольскага**, прэзыдэнта Расейскага саюзу прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. Вольскі нарадзіўся ў 1932 г. у Добрушы. Бацькі — настаўнікі. У маладосьці займаўся спортам: Вольскі — майстар спорту па боксе і фэхтаваньні, чэмпіён Беларусі па боксе. У пачатку 1950-х зьехаў на вучобу ў Маскву, дзе й застаўся. Пачынаў з працы ў ліцейным цэху маскоўскага аўтазаводу імя Ліхачова, а ў пачатку 80-х ужо быў памочнікам генсака КПСС Андропава па пытаньнях эканомікі. У 1990 г. А.Вольскі ачоліў Навукова-прамысловы саюз СССР (папярэднік Расейскага саюзу прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў), які надоўга пераўжыў сам Савецкі Саюз. Ён мае імідж чалавека, які вырашае складаныя палітычныя праблемы (Нагорны Карабах, Чачэнія ды інш.). Пры гэтым кіруецца прынцыпамі: ня здраджваць сябрам, ня браць хабару і не губляць прыстойнасьці.

Старшыня рады дырэктараў «Масбізнэсбанку» **Віктар Буката** паходзіць зь Пінску, дзе нарадзіўся ў чэрвені 1939-га, напярэдадні другой сусьветнай вайны. Яе часта згадвае ў сваіх інтэрвію Буката, бо падчас нямецкай акупацыі ён ледзь не загінуў, запомніўся і голад першых пасьляваенных гадоў. Віктар Буката марыў стаць геолягам, але лёс пакіраваў яго ў банкіры. Кар'еру ў Маскве пачаў у 1970-я з пасады намесьніка старшыні Будбанку СССР. У 1988 г. стаў старшынём праўленьня Банку жыльлёва-камунальнай гаспадаркі і сацыяльнага разьвіцьця СССР. Апошнія пяць гадоў кіруе «Масбізнэсбанкам».

Працяг на старонцы 4.



Георгі Шпак



Пятро Клімук

# Сяргей Скрабец: «Рыхтуецца нейкі рэфэрэндум»




**За два гады Сяргей Скрабец прайшоў шлях ад лукашыстаў да апазыцыйнай «Рэспублікі»**

Перад тым як стаць кіраўніком парлямэнцкай групы «Рэспубліка», Сяргей Скрабец 22 дні прагаладаў («Падчас вялікага посту трэніраваўся — піў адну ваду»). Досьвед галадоўкі, магчыма, яшчэ спатрэбіцца: супраць кіраўніка «Рэспублікі» і былога гендырэктара гандлёвага дому «БелБабаеўскае» Сяргея Скрабца ўзбуджана крымінальная справа. Ён абвінавачваецца ў невяртаньні крэдытаў і стварэньні злачыннай групоўкі (ч.4 арт.16 і ч.2 арт.237 Крымінальнага Кодэксу, прадугледжваюць ад 2 да 5 гадоў пазбаўленьня волі). Маюцца на ўвазе крэдыты, якія браў гандлёвы дом «БелБабаеўскі». Раней па гэтай справе Скрабец праходзіў як сьведка. Вінаватым ён сябе ня лічыць, таму ў Пракуратуру не зьявіўся. Паводле слоў Скрабца, калі «БелБабаеўскае» атрымлівала крэдыты, ён ужо не зьяўляўся гендырэктарам фірмы, а працаваў дэпутатам. Мяркуе, што ўзбуджэньне крымінальнай справы зьвязана зь яго старшынствам у «Рэспубліцы». Яшчэ два гады таму дэпутат Скрабец браў удзел у перадвыбарнай кампаніі Лукашэнкі — спартовых мерапрыемствах у Менску. А цяпер — такі паварот лёсу.

**«НН»: Чым «Рэспубліка» так магла напужаць уладу?**

**С.С.**: Я ня думаю, што мы нясём нейкую рэальную пагрозу. Мы нават ня можам паўплываць на прыняцьце законаў. Нядаўна прынялі закон аб тым, што палітычную партыю можна па любой пстрычцы закрыць. Мы, напрыклад, галасавалі супраць, а парлямэнт — за. Мы ня лічым сябе апазыцыяй. Мы проста маем свае гледзішча на тое, што адбываецца ў дзяржаве.

Усе гэтыя крокі па запалохваньні — падрыхтоўка да нейкага рэфэрэндуму. Разам з пытаньнямі аб якім-небудзь сьмяротным пакараньні, аб саюзе з Расеяй будзе пара пытаньняў, што прыбяруць некаторыя нормы з Канстытуцыі. Я ня думаю, што там адкрыта будзе ставіцца пытаньне пра трэці тэрмін кіраваньня — ва ўладзе ж таксама разумныя людзі сядзяць.

**Вераніка Дзядок**

# Зона без памераў




**Праект ахоўнай зоны вакол Курапатаў, распрацаваны на замову Асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, прыняты. Аднак «Вігэўрабуд» не адракаецца сваёй задумы збудаваць ля Курапатаў катэджны пасёлак «Сонечны».**

20 траўня навукова-мэтадычная рада Дэпартамэнту захаваньня гісторыка-культурнай спадчыны зацьвердзіла праект ахоўнай зоны вакол Курапатаў. («НН» пісала пра гэты праект у №14.) Але памеры ахоўнае зоны будуць вызначаныя толькі пасьля таго, як Савет Міністраў прызначыць установу — уласьніка ўрочышча і прыме канкрэтны плян мэмарыялізацыі Курапатаў. Спадзявацца на тое, што плян мэмарыялізацыі будзе падрыхтаваны найбліжэйшым часам, не выпадае: у Міністэрства культуры на гэта няма грошай. Тым ня менш, цяпер на прылеглай да Курапатаў тэрыторыі, паводле словаў чыноўнікаў Дэпартамэнту, нельга будаваць.

Кіраўнік будаўнічай фірмы «Вігэўрабуд» Уладзімер Асіповіч паставіўся да рашэньня навукова-мэтадычнай рады скептычна: «Нічога яны не прынялі — гэта блеф, які цягнецца з 1989 году. Вакол Курапатаў ідзе палітычная гульня. Мы адступілі 150 м і захавалі санітарную зону. А з адваротнага боку ідзе ўпарадкаваньне трасы Заслаўе—Калодзішчы, і там бульдозэр працуе проста ў лесе». У.Асіповіч упэўнены, што рашэньне Дэпартамэнту ніяк не адаб'ецца на ягоных справах.

Тым часам КХП—БНФ зладзіла ў Курапатах талаку для аднаўленьня разбураных вандаламі крыжоў, а «Малады фронт» разглядае магчымасьць аднаўленьня сталае вахты памяці ў Курапацкім лесе. У сераду невядомыя аблілі чырвонай фарбай будаўнічую тэхніку на пляцоўцы катэджнага пасёлку. Пра гэта паведаміў агенцтву БелаПАН адзін з абаронцаў Курапатаў, які не захацеў сябе назваць.

**АШ**

# Мы Маскве прыслалі падкрапленьне

Працяг са старонкі 3.



**Пятро Чыпура**

Буката любіць расейскую клясычную музыку, творы расейскіх пісьменьнікаў, а на беларушчыну забыўся.

## Сілавікі

Яшчэ ў савецкія часы беларускія «кадры» ў Маскве лічыліся самымі стараннымі. І цяпер у Расеі могуць адшукацца дзясяткі беларусаў, якія займаюць (альбо займалі) уплывовыя пасады ў войску, міліцыі, ФСБ. Тут і касманаўты-генэралы **Ўладзімер Кавалёнак** ды **Пятро Клімук**, і «галоўны дэсантнік» Расеі генэрал-палкоўнік **Георгі Шпак**, і намесьнік камандзіра Балтыйскага флёту віцэ-адмірал **Васіль Апановіч**, і многія іншыя. Беларусы служаць ня толькі ў Маскве, але і ў расейскай правінцыі. Ад сьнежня 2001 г. органамі ўнутраных справаў Валгаградзкай вобласьці кіруе 48-гадовы генэрал-маёр **Пятро Чыпура**. Ён не хавае свайго беларускага паходжаньня. А валгаградзкі губэрнатар Мікалай Максюта неяк прызнаўся: любіць Чыпуру менавіта за тое, што ён беларус, як і сябар ягонай вобласьці Аляксандар Рыгоравіч... Цікава, што Чыпура не выпадкова «выплыў» з Самары ў Валгаград. Ён мае надзейны «дах» у Маскве, у міністэрстве. Сярод ягоных «куратараў» — генэрал Міхаіл Нікіфараў.

## Дысыдэнты

Гэтыя людзі, зразумела, ні на што ўжо не прэтэндуюць і ўсур'ёз расейскімі ўладамі не разглядаюцца. Зорныя часы дысыдэнтаў прыйшліся на канец 80 — пачатак 90-х, калі яны спрычыніліся да краху камуністычнай імпэрыі.

Лідэрка партыі «Дэмакратычны саюз Расеі» **Валерыя Навадворская** нарадзілася 17 траўня 1950 г. у Баранавічах. Упершыню яе арыштавалі ў 19 гадоў за «антысавецкую агітацыю і прапаганду». Пасьля былі «псіхушкі», суды, распаўсюд самвыдату, спроба ў 70-я стварыць падпольную партыю для барацьбы супраць КПСС. У 1988 г. яна заснавала арганізацыю «Дэмакратычны саюз», у тыя часы вельмі актыўную, якая цяпер трансфармавалася ў партыю. У траўні 1991-га Навадворская трапіла за краты за зьнявагу гонару і годнасьці прэзыдэнта СССР і дзяржаўнай сымболікі. Толькі параза жнівеньскага путчу 1991 г. зрабіла яе свабоднай. Яна і цяпер застаецца ў апазыцыі расейскай уладзе, час ад часу, праўда, яе падтрымліваючы, калі трэба змагацца супраць «чырвона-карычневых». Пра Беларусь Навадворская не забываецца і калісьці нават зьбіралася ствараць партызанскія аддзелы на выпадак расейскай акупацыі.

Яшчэ адзін былы савецкі дысыдэнт паходзіць з Заходняй Беларусі — гэта **Віктар Аксючыц**. Ён нарадзіўся ў 1949 г. у вёсцы Варданцы Маладачанскага раёну ў сялянскай сям'і. У 1964 г. паступіў у Рыскую мараходную вучэльню, аднак не давучыўся, служыў на Балтыйскім флёце. Пасьля вучыўся на філязофскім факультэце Маскоўскага ўнівэрсытэту, у 1978 г. стаў асьпірантам катэдры замежнай філязофіі, пісаў дысэртацыю на тэму тагачаснага замежнага пратэстанцтва. У 1979-м В.Аксючыц выйшаў з КПСС, пачаў займацца распаўсюдам рэлігійнага і палітычнага самвыдату. За гэта яго выключылі з асьпірантуры. Аж да 1987 г. Аксючыц працаваў на сэзонных работах у калгасах ды саўгасах Сібіры, Далёкага Ўсходу, Казахстану. У часы перабудовы ён шмат друкаваўся за мяжой, выдаваў «літаратурна-філязофскі часопіс расейскай хрысьціянскай культуры «Выбар». У 1990 г. Аксючыц становіцца дэпутатам Вярхоўнага Савету Расеі, узначальвае Расейскі хрысьціянскі дэмакратычны рух, удзельнічае ў розных «патрыятычна-праваслаўных» кааліцыях. Цяпер Аксючыц працуе памочнікам у Барыса Нямцова, хваліцца, што ўвёў яго ў палітыку. Яшчэ В.Аксючыц займае пасаду дацэнта Дзяржаўнай акадэміі славянскай культуры, выдае кніжкі, у якіх выступае як праваслаўны фундамэнталіст. Што да асабістага жыцьця, дык у біяграфіях, напісаных непрыяцелямі В.Аксючыца, адзначаецца: «часта жанаты, адна з жонак — кіраўніца габрэйскага тэатру».



**Віктар Аксючыц**

Калі б у Беларусі быў іншы палітычны рэжым, «маскоўскія землякі» маглі б зьмяніць сваё стаўленьне да яе незалежнасьці і хутка «перабудавацца». Будучы ў Расеі «варагамі», многія зь іх не хацелі б губляць сувязяў і з Бацькаўшчынай. Можна прыгадаць хоць бы той факт, што ў жніўні 1991-га бел-чырвона-белы сьцяг у залю беларускага парлямэнту разам з Лукашэнкам уносіў касманаўт Кавалёнак.

Цяжка сабе ўявіць на першых ролях у фінскай ці нямецкай палітычцы чалавека, які вырас у іншай краіне. Няма лепшага сьведчаньня таго, што Расея застаецца больш савецкай, як нацыянальнай дзяржавай, чым склад расейскае палітычнае эліты. Гэтыя колы ня трацяць надзеі поўнага аднаўленьня ўплыву Масквы ў страчаных ускраінах сьледам за экспансіяй расейскага капіталу. Калі беларускія эліты пагодзяцца ажыцьцявіць пілётны варыянт такой інтэграцыі, у Менску, нібы ў Грозным, побач з «нацыянальным лідэрам» зьявіцца і маскоўскі дарадца. У гэтым выпадку ім напэўна стане нехта з вышэйакрэсьленага сьпісу.

**Алег Тачоны**



**Валерыя Навадворская зьбіралася ствараць беларускія партызанскія атрады**

## Расейскія прыхільнікі беларускай незалежнасьці

У Расеі ёсьць даволі шмат беларусаў — прыхільнікаў незалежнасьці нашай краіны, якія адмоўна ставяцца да інтэграцыі. У адной Маскве іх вунь колькі: **Генадзь Лех** — старшыня «Грамады беларускай культуры імя Ф.Скарыны» і кіраўнік «Міжрэгіянальнага аб'яднаньня беларусаў у Расеі», **Таіса Мішчанка** — яго намесьніца і кансультантка адвакацкай фірмы, **Аляксей Каўка** — гісторык і літаратуразнаўца, **Алеся Бабарэка** — кандыдатка навук, **Аляксей Бука** — супрацоўнік аўтамабільнай фірмы ды іншыя. У Пецярбурзе жывуць вядомыя незалежнікі—прафэсары **Валянцін Грыцкевіч** і **Мікола Нікалаеў**. Вельмі актыўны ў Іркуцку **Алег Рудакоў**, а ў Сыктыўкары — **Віктар Сулкоўскі**. І сьпіс гэты можна доўжыць. «Інтэгратары працуюць за грошы, а мы — за ідэю», — кажуць незалежнікі. Шэрагі ідэйнікаў папаўняюцца найбольш зь ліку імігрантаў малодшага пакаленьня, што выехалі ўжо зь незалежнае Беларусі, у прыватнасьці студэнтаў (многія зь іх па вяртаньні на бацькаўшчыну ўладкоўваюцца на працу ў дзяржструктуры, у тым ліку Міністэрства замежных справаў, ідуць у беларускі бізнэс), а таксама дыпламаваных спэцыялістаў. Сярод такіх, напрыклад, тэлежурналіст **Віктар Дзятліковіч**.

# Непадкаваных падкаваць

**Беларускі студэнт павінен быць ідэалягічна падкаваным. Гэта новая задача, пастаўленая сёньня перад беларускімі ВНУ. Такая выснова вынікае з «ідэалягічнага» дакладу міністра адукацыі Пятра Брыгадзіна, агучанага 14 траўня ў Горадні на Рэспубліканскай нарадзе рэктараў ВНУ. Унівэрсытэцкая эліта напаўзабытую для сябе функцыю ўспрыняла пакорліва, моўчкі, без дыскусіяў і нават элемэнтарнага абмеркаваньня.**

Маўклівасьць рэктараў, пэўна, была абумоўлена месцам правядзеньня нарады. Сэнатарская заля Новага каралеўскага палацу, дзе адбываўся круглы стол, вядомая тым, што ў 1793 г. тут прайшоў сумнавядомы «маўклівы сойм», вынікам якога стаўся другі падзел Рэчы Паспалітай. Вынікам нарады, час пацьвердзіць, можа стаць падзел студэнцтва на «вартых і нявартых» фармаваць «аблічча нашага грамадзтва».

Кожны ўдзельнік нарады атрымаў разам з камплектам дакумэнтаў сьвежавыдадзеную лекцыю Аляксандра Лукашэнкі «Гістарычны выбар Беларусі», прачытаную сёлета ў сакавіку студэнтам БДУ. Ідэалягічная работа з моладзьдзю, абвесьціў міністар, ёсьць найважнейшым складнікам усёй ідэалягічнай работы ў дзяржаве, бо моладзь — «генэратар самых радыкальных ідэй у грамадзтве». Таму ўнівэрсытэты павінны навучыць маладых людзей «адрозьніваць палітычны авантурызм ад канструктыўнай крытыкі».

Што ж чакае беларускіх студэнтаў? «Ідэалягічная работа будзе сыстэмнай і бесьперапыннай» і ахіне ўсе сфэры іх жыцьця. Ва ўнівэрсытэтах паўстане ідэалягічная вэртыкаль, кіраваць якой будзе рэктар. У ідэалягічную работу ўключацца ўсе работнікі ВНУ. Студэнцкія групы ўзначаляць вернутыя «куратары», бо, паводле міністра, «кожны выкладнік павінен быць адказным за тое, што ён робіць у студэнцкіх аўдыторыях».

Да новага году ва ўсе навуковыя праграмы грамадазнаўчых дысцыплінаў павінны быць унесеныя зьмены. Пятро Брыгадзін у сваім дакладзе акрэсьліў характар гэтых зьменаў: дысцыпліны павінны адпавядаць беларускай мадэлі разьвіцьця. Якасьць падручнікаў, перадусім па гуманітарных дысцыплінах, будзе шчыльна кантралявацца міністэрствам адукацыі. Тэмы навуковых дасьледаваньняў таксама маюць быць скарэктаваныя ў кірунку ідэалягічнай работы.

Пад ідэалягічны ўплыў трапяць і інтэрнэт-зацікаўленасьці моладзі. Напаўненьне ВНУшных сайтаў, якімі карыстаецца моладзь, павінна адпавядаць задачы ідэалягічнай работы. Задача ідэалёгіі акрэсьлена яскрава — гэта павага да беларускай дзяржаўнай улады.

Істотная роля ў ідэалягізацыі беларускага студэнцтва адводзіцца моладзевым прадзяржаўніцкім арганізацыям — БРСМу і студпрафкамам.

Міністар, выступаючы перад рэктарамі, запатрабаваў у сьціслы тэрмін скончыць фармаваньне суполак БРСМ у ВНУ. Ва ўнівэрсытэты вернецца тое, што, паводле словаў Пятра Брыгадзіна, «спрацоўвала раней», — школы лектараў, факультэты грамадзкіх прафэсіяў, будатрады, моладзевая сымболіка, штогадовыя сустрэчы рэктараў з студэнтамі.

Стан ідэалягічнай працы ў вышэйшых навучальных установах плянуецца двойчы на год — раз на сэмэстар — дбайна адсочваць.

Рэктарскі склад выслухаў даклад міністра моўчкі. Адзінае зададзенае пытаньне было вартае самога дакладу — што рабіць з начнымі дыскатэкамі, якія, маўляў, перашкаджаюць рэктарам выхоўваць студэнцтва ў правільным духу. Адказ міністра ўжо не зьдзівіў: арганізуйце вучэбны працэс так, каб студэнты не змаглі хадзіць на начныя дыскатэкі.

**ПМ, Горадня**

# «Зьневажальнікаў» усё больш

**20 траўня суд Маскоўскага раёну Менску даў штрафу галоўнаму рэдактару газэты «Навінкі» Паўлюку Канавальчыку. Яго абвінавацілі ў «распаўсюдзе яўна хлусьлівых зьвестак, якія зьневажалі гонар і годнасьць прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі». Колькасьць справаў па фактах «зьнявагі» кіраўніка дзяржавы дасягнула двух дзясяткаў. Ніводзін з абвінавачваных не апраўданы.**




«НАВІНКІ»

**Падтрымаць Паўлюка Канавальчыка ў дзень суду прыйшлі супрацоўнікі і прыхільнікі газэты «Навінкі»**

П.Канавальчык быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці па арт. 172-1 ч.10 за ананімны артыкул «Другая Беларуская Канататыўная Рэвалюцыя», надрукаваны ў сёмым сёлетнім нумары газэты ў сакавіку. Прэзыдэнцкія гонар і годнасьць, на думку пракуратуры, абражаў зьмешчаны ілюстрацыйны матэрыял — два аднолькавыя старыя перадвыбарныя плякаты Лукашэнкі з рознымі камэнтарамі да іх. Напрыклад, з такім: «Шырока расстаўленыя пальцы — сымбаль бязьлітаснага забойцы палітычных апанэнтаў»…

Цікава, што матэрыялы на Канавальчыка паступілі ў Маскоўскі суд ад намесьніка генэральнага пракурора (галоўны рэдактар «Навінак» ужо даваў тлумачэньні ў генпракуратуры). А сам суд прайшоў за гадзіну ў будынку… райаддзелу міліцыі. «Каб зручна было разглядаць справы, пасадзілі судзьдзю тут», — патлумачыў сытуацыю адзін зь міліцыянтаў. Судзьдзя Максім Фалько зацягнуў пачатак працэсу (ніяк ня мог знайсьці сакратара), а пасьля не пусьціў на паседжаньне журналістаў. У выніку ўсе хадайніцтвы абароны (адвакатам Канавальчыка быў Павал Сапелка, які зусім нядаўна бараніў у судзе Аксану Новікаву) былі адхіленыя. Судзьдзя не дазволіў правесьці экспэртызу «крамольных» матэрыялаў газэты, спаслаўшыся на тое, што «сканчаецца тэрмін прыцягненьня да адміністрацыйнай адказнасьці», і нават не патлумачыў, за якую зь дзьвюх ілюстрацый быў пакараны Паўлюк. Так гэта і засталося таямніцай.

У выніку галоўны рэдактар «Навінак» мусіць сплаціць дзяржаве штраф у 1 мільён 400 тыс. рублёў. Грошы будуць вылічацца зь невялічкага заробку П.Канавальчыка, і асуджаны мяркуе расьцягнуць спагнаньне штрафу на 4—5 гадоў.

Праваабарончы цэнтар «Вясна» падлічыў: па крымінальных справах «за абразу гонару і годнасьці» прэзыдэнта ў 2001—2003 г. праходзіла 19 чалавек (журналісты, палітыкі і моладзевыя актывісты). Яны праходзілі па артыкулах КК 367 («Зьнявага прэзыдэнта») і 368 («Абраза прэзыдэнта»). Да «хіміі» прысудзілі журналістаў-пагоняўцаў Міколу Маркевіча і Паўла Мажэйку, рэдактара «Рабочага» Віктара Івашкевіча. Пяцёра шклоўскіх зуброўцаў — Міхась Кісялёў, Максім Патупчык, Алесь Паўловіч, Дзяніс Сенакосаў і Зьміцер Шалашкаў — за перадвыбарны пэрформанс з вусатай маскай заплацілі штрафам і адлічэньнем з навучальных установаў. Актывістка АГП з Рэчыцы Натальля Брэль, што перадала Лукашэнку досыць двухсэнсоўныя сувэніры, перад пагрозай арышту ўцякла ў Бэльгію. Крымінальныя справы ўзбуджаліся супраць журналісткі Алены Панкратавай, палітыка Анатоля Лябедзькі — за артыкул у «Народнай волі». Апошні выпадак — Аксана Новікава, асуджаная на два гады ўмоўна. Не апраўдалі ніводнага. «Справа Канавальчыка», не крымінальная — адміністрацыйная, выглядае як папярэджаньне сатырычнай газэце, зь якой улада пакуль ня хоча судзіцца.

**Алег Тачоны**

# Прыпыненая ліцэнзія «Энцыкляпэдыксу»




**Даўно на паліцах кнігарняў не зьяўляліся новыя кніжкі выдавецтва «Энцыкляпэдыкс». Гэтае зацішша пасьля леташняе актыўнасьці — тады пад яго эгідай штомесяц выходзіла некалькі кніг, а сярод прадукцыі былі такія значныя пазыцыі, як збор твораў Янкі Станкевіча, фундамэнтальны падручнік «Паліталёгія», кнігі зь «Бібліятэкі «Беларускага гістарычнага агляду», — прыцягнула ўвагу карэспандэнта «НН».**

Як аказалася, нездарма. Выдавецтва ўжо трэці месяц прастойвае, бо ў сярэдзіне лютага Міністэрства інфармацыі прыпыніла выдавецкую ліцэнзію гэтай структуры. Як было зазначана ў афіцыйным загадзе, «за няправільную рубрыкацыю» выданьняў. Генэральны дырэктар выдавецтва Ігар Чыкалаў наконт прыпыненьня ліцэнзіі гаворыць неахвотна: «Мы законапаслухмяныя грамадзяне; нас пакаралі за нашыя памылкі — мы цяпер выпраўляемся».

Магчыма, у прыпыненьні выдавецкай ліцэнзіі «Энцыкляпэдыксу» ёсьць палітычны матыў. Адной зь «няправільна рубрыкаваных» кніг сталася праца Леаніда Злотнікава «Ў пятлі папулізму». Чыноўнікі палічылі гэты зборнік артыкулаў грамадзка-палітычным выданьнем, а выдавецтва мае ліцэнзію толькі на выпуск навукова-папулярнай прадукцыі.

Паводле словаў кіраўніка Цэнтру прававой абароны журналістаў Міхала Пастухова, у Польшчы, Літве такія выпадкі папросту немагчымыя: «Там могуць указаць выдавецтву на дапушчаную памылку, але ж не прыпыняць ліцэнзію».

Новыя кнігі ад «Энцыкляпэдыксу» могуць зьявіцца не раней чым у ліпені — калі скончыцца тэрмін прыпыненьня ліцэнзіі.

**АВ**

# Прабачацца Буцько ня будзе

У чацьвер 15 траўня ў Берасьці калегія па грамадзкіх справах абласнога суду разглядала касацыйную скаргу журналіста газэты «Заря» Івана Буцька і баранавіцкай газэты «Наш край» на рашэньне баранавіцкага суду. Іван Буцько ўсё ж такі прызнаны вінаватым у абразе гонару і годнасьці старшыні Баранавіцкага аддзяленьня «Фонду імя братоў Луцкевічаў» Алеся Горбача і павінен сплаціць яму 50 тыс. рублёў, газэта «Заря» — 300 тысяч, а баранавіцкая раёнка «Наш край» нічога нікому ня вінная. Акрамя таго, 220 тыс. рублёў «Заря» і 100 тыс. Буцько мусяць выплаціць за судовыя выдаткі. Адмененае таксама рашэньне Баранавіцкага суду аб афіцыйным прабачэньні аўтара артыкулу на старонках газэтаў. Бо «няма такога віду кампэнсацыі маральнае шкоды, як прабачэньне».

Ні Алесь Горбач, ні Іван Буцько ня згодныя з рашэньнем абласнога суду і зьбіраюцца абскарджваць гэта рашэньне. Журналіст па-ранейшаму лічыць сабе крыштальна чыстым чалавекам, а выкрыцьцё апазыцыянэраў і ворагаў дзяржавы — сваім абавязкам.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

За ўдзел у акцыі 14 траўня на Кастрычніцкім пляцы Менску суд Цэнтральнага раёну асудзіў маладафронтаўцаў Зьмітра Дашкевіча і Алеся Тарасевіча на 3 і 10 сутак адпаведна. 14 траўня Менскі гарадзкі суд зацьвердзіў вырак суду Цэнтральнага раёну Менску адносна Аксаны Новікавай, якую прызналі-такі віноўнай у паклёпе на Аляксандра Лукашэнку. 19 траўня ў Горадні быў разагнаны «мітынг маўчаньня прадпрымальнікаў» (яны вырашылі не скандаваць ніякіх лёзунгаў — папросту выйсьці разам на плошчу Леніна), скіраваны супраць згаленьня насельніцтва: супраць 50 удзельнікаў былі выстаўленыя 25 «ахоўнікаў парадку». 19 траўня за арганізацыю маршу «За лепшае жыцьцё!» быў завочна асуджаны Юры Хадыка. Цяпер прафэсар Хадыка знаходзіцца на нелегальным становішчы: калі цягам трох месяцаў ён трапіцца міліцыянтам, яго адправяць адбываць пакараньне.

# Развагі пра тое, чаго ў нас больш за ўсё няма

**Ну і атрымалі на арэхі ўрадавыя эканамісты 20 траўня! У Міжнародным адукацыйным цэнтры (IBB) адбылася канфэрэнцыя «Эканамічная трансфармацыя ў Беларусі і роля міжнародных донарскіх арганізацыяў». Дзеля таго што першага ў краіне амаль не назіраецца, другое, адпаведна, таксама зьведзенае да нуля. Так што канфэрэнцыя мела характар парадаў для ўраду з шматлікімі «патрэбна, варта, пажадана».**

## Дзьве душы бізнэсу

Павал Данэйка, прэзыдэнт Інстытуту прыватызацыі ды мэнэджмэнту (ІПМ), распавёў пра «фэномэн прадпрыемства» ў беларускай эканоміцы. У нас дагэтуль няма сапраўдных фірмаў ды кампаніяў — спрэс прадпрыемствы. Ім уласцівая неэфэктыўная праца ды ўнутраная карупцыя. Было б паўбяды, калі б карупцыяй арганізавана займаўся ўвесь мэнэджмэнт, — дык не, крадуць асобныя кіраўнікі. Межы прадпрыемства размытыя, мноства рэсурсаў, якімі яно карыстаецца, не належаць яму фармальна. Таму яго цяжка акрэсьліць, ацаніць і прадаць.

Паводле словаў Паўла Данэйкі, у Беларусі наймацнейшая ў СНД падтрымка прыватнага бізнэсу сярод насельніцтва. Шмат хто тут жадае распачаць сваю справу, але ня можа пераступіць унутраны бар'ер. Беларускі бізнэс — бізнэс пэсымістаў. Ён мае два маральныя ўзроўні, дзьве душы.

## Рэформы

Неяк міністар фінансаў Корбут пабяцаў сысьці ў адстаўку, калі нехта прапануе бездэфіцытны бюджэт. Яраслаў Раманчук, прэзыдэнт Цэнтру Мізэса, заклікаў міністра «падмацаваць заяву рэальнымі дзеяньнямі» і прэзэнтаваў праект бездэфіцытнага бюджэту, роўнага 3,2 млрд. даляраў — столькі патрэбна, каб урад «не падняў на вілы».

ІПМ прапануе заканадаўча замацаваць норму бездэфіцытнага бюджэту, бо дэфіцыт развязвае рукі карупцыянэрам. Прадстаўнікі Міністэрства эканомікі дужа абурыліся гэтай прапановай — маўляў, бюджэт фармуюць законы рынку, а не дзяржавы.

Змагацца з інфляцыяй ІПМ прапануе, прывязаўшы беларускі рубель да эўра ды фіксуючы абменны курс, пакуль інфляцыя ня зьнізіцца да 5%.

## Раўненьне на монстра

Чаму рэформы ня рухаюцца? Данэйка адказвае: «Мы дагэтуль паўсюдна называем Беларусь «рэспублікай». Пакуль не пачнём называць яе краінай, быць адказнымі за яе, пра рэформы думаць ня варта».

Аляксандар Сасноў, кандыдат эканамічных навукаў, намесьнік дырэктара Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, быў яшчэ больш рэзкі: «Чаго мы бяром гэтага монстра — Расею — і спрабуем раўняцца зь ім? Чаму не бяром суседнія краіны — Польшчу, Літву?»

## Мільярд будучаму ўраду

Пра працу донарскіх арганізацыяў распавялі канспэктыўна. Дый што пра яе казаць, калі тая дапамога складае толькі 0,74% ад ВУП краіны. Горш за нас хіба Туркмэністану. Калі б урад праводзіў рэформы, тая дапамога была б у 3-4 разы большай і цягам пяці гадоў магла б скласьці каля мільярда даляраў.

Імпрэзу наведаў і амэрыканскі амбасадар Козак. Ён усьміхаўся, піў мінэралку, а ў часе экскурсаў у нетры фіскальнай палітыкі пакрысе пачаў драмаць. Пасьля канфэрэнцыі амбасадар паехаў пад'есьці ў суседні «Макдональдз». Відаць, настальгія.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Праект 801»

**Хто ўратуе гаспадарку — малы бізнэс ці прамысловыя гіганты?**

Тое, што прыватызацыя ледзьве ліпіць, — факт. Аднак тармозіць яе ня толькі дзяржава, але і законы рынку. Акцыянаваць дзяржпрадпрыемства лёгка, а прыватызаваць цяжка, бо далёка не на ўсе акцыі знаходзіцца пакупнік. Многія прадпрыемствы, якім не знайшліся новыя гаспадары, неўзабаве банкрутуюць. Пазьбегнуць масавай «санітарна-зьнішчальнай» прыватызацыі можна, аб'яднаўшы некалькі прадпрыемстваў у холдынг*. Тады больш моцныя прадпрыемствы за свой кошт «выцягваюць» слабыя, ратуючы іх ад банкруцтва.

Стварэньне буйных холдынгаў меў на мэце так званы «Праект 801», якім у 90-я гады займалася Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя пры падтрымцы Праграмы разьвіцьця ААН. Пляны былі сур'ёзныя: рэструктурызаваць беларускую эканоміку шляхам канцэнтрацыі найбольш важных прадпрыемстваў ды кіраваньня імі праз групу холдынгаў.

Замежныя экспэрты раілі ствараць холдынгі ў аўтамабільнай, хімічнай галіне, машына- ды станкабудаўніцтве. БНПА мусіла падрыхтаваць плян «узбуйненьня», адабраць 20—30 топ-мэнэджэраў, аб'яднаць іх у 4-5 камандаў ды навучыць кіраваць буйным прамысловым аб'яднаньнем. Першы холдынг мусіў аб'яднаць каля 20 станкабудаўнічых прадпрыемстваў.

Але ПРААН спыніла фінансаваньне і праект адклалі ў шуфляду. Нядаўна Клёд Патэль, былы куратар «холдынгавага» праекту ад ПРААН, зноў зьвярнуўся ў БНПА з прапановай супрацоўніцтва. Праўда, гэтым разам ПРААН жадае дапамагаць не далярамі, а парадамі, таму справа зноў тармозіцца.

У Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі кажуць, што час працуе не на карысьць беларускіх прадпрыемстваў. Без істотных рэформаў яны рызыкуюць страціць рынкі збыту. «Расея пайшла далёка наперад, — кажа Валеры Шашкоў, экспэрт БНПА. — Яна ўзнаўляе свае вытворчыя магутнасьці. Хутка КамАЗ будзе ў стане забраць долю расейскага рынку, якую пакуль займае МАЗ. Падцягваюцца і аўтобусныя заводы. У Беларусі даўно не займаліся тэхнічным пераабсталяваньнем вытворчасьці, таму расейскіх партнэраў ужо не задавальняе якасьць нашай прадукцыі, яны ня хочуць з намі працаваць».

Размовы пра стварэньне буйных прамысловых групаў у Беларусі ўзьнікаюць рэгулярна. Цяпер урад жадае ствараць холдынг, што будзе вырабляць вялікагрузныя аўтамабілі. Прэм'ер Навіцкі заявіў, што Магілёўскі аўтазавод мусіць увайсьці ў склад БелАЗу, бо той вырабляе лепшыя машыны, але пры гэтым выкарыстоўвае вытворчыя магутнасьці МаАЗу.

Кіраўніцтва канцэрну «Беллегпрам» таксама марыць пра стварэньне недзяржаўнага холдынгу, што аб'ядноўваў бы 100 прадпрыемстваў лёгкай прамысловасьці. Буйныя фірмы ў складзе холдынгу трансфармуюць у сярэднія ды дробныя, бо таго патрабуе рынак.

Пра свой холдынг падумвае і «Белхарчпрам». Аб'яднаўшыся, «Спартак», «Камунарка» ды «Чырвоны мазыранін» маглі б кантраляваць 42—43% беларускага рынку. «Спартак» ды «Камунарка» ўжо падзялілі асартымэнт і дапамагаюць адно аднаму сыравінай.

Гучнай гісторыяй летась была спроба ствараць так званы «паўночны куст» — холдынг на базе Навапалацкай ЦЭЦ, «Нафтану» ды «Палміру». Калі прыватызацыя нафтахіміі праваліцца, «куст» можа і сапраўды вырасьці.

**АК**

* У перакладзе з ангельскай «to hold» азначае «трымаць». Холдынг — гэта кампанія, у склад актываў якой уваходзяць кантрольныя пакеты акцыяў іншых (дачэрніх) прадпрыемстваў. У склад найбуйнейшых холдынгаў нярэдка ўваходзіць банк ды «свая» страхавая кампанія.

# Прыйшоў чарод і на чарот



**У вёсцы Занарач на Мядзельшчыне ў суботу адкрылі цэх для вытворчасьці ўцяпляльніку з чароту. Ідэю прывезьлі з Эўропы, дзе чаротавыя пліты выкарыстоўваюць падчас будаўніцтва дамоў, бо гэта добры, танны і экалягічна чысты матэрыял.**

Вырашылі зрабіць гэтак і ў Беларусі. Чарот зімой нарыхтоўвалі на Нарачы і іншых азёрах. У цэху занятыя сем чалавек, якія атрымаюць неблагія па вясковых мерках грошы. А ўцяпляльныя пліты павязуць найперш у Лепель, дзе будуюць дамы для перасяленцаў з чарнобыльскай зоны.

Адзін з спонсараў праекту — урад ФРГ, а ажыцьцяўляюць яго дабрачынная арганізацыя «Дамы замест Чарнобылю» зь Нямеччыны і яе беларускі партнэр «ЭкаДом». Зь іх дапамогай на Мядзельшчыне ўжо збудавалі цэлую вёску Дружная для перасяленцаў з забруджанай зоны, а побач паставілі дзьве ветраэнэргетычныя ўстаноўкі.

**Алесь Высоцкі, Мядзел**

# Малы бізнэс будзе дамінаваць

**Д-р Джон Скемпэр,** эканаміст рэгіянальнай місіі (Украіна) Агенцтва ЗША па міжнароднаму разьвіцьцю USAID, камэнтуе пляны стварэньня буйных прамысловых групаў у Беларусі:

— Паводле міжнароднай клясыфікацыі, малы бізнэс — гэта фірма, на якой працуюць да 10 чалавек, сярэдні — ад 10 да 200, буйны мае больш за 200 супрацоўнікаў. У Беларусі павінен разьвівацца перш за ўсё малы ды сярэдні бізнэс, каб замясьціць тыя працоўныя месцы, якія ўрэшце згубяць вялікія прадпрыемствы. Беларускай эканоміцы насамрэч патрэбная грунтоўная рэструктурызацыя. У некаторых выпадках — зьмяншэньне памеру прадпрыемстваў, пошук замежнага партнэра ці нават банкруцтва, у іншых — зьліцьцё фірмаў. Усё гэта натуральна для дынамічнай рынкавай гаспадаркі. Вядома, дзьве фірмы, справы якіх ідуць ня дужа добра, могуць спалучыць свае рэсурсы і ўтварыць адну моцную кампанію. Аднак, як паказвае сусьветны досьвед, дамінаваньне буйных прадпрыемстваў у беларускай эканоміцы зьменіцца дамінаваньнем малога ды сярэдняга бізнэсу. Праз гэта прайшлі нават мы ў ЗША.

## ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### ГЭС-каскад

**Да 2008 г. на Дзьвіне збудуюць каскад з чатырох ГЭС.** Першую станцыю пусьцяць у 2006 г. Адначасова Міністэрства энэргетыкі ўзялося вывучаць досьвед Швэцыі, дзе чвэрць энэргіі атрымліваюць, спальваючы адкіды дрэваапрацоўкі.

### Лямпачкам — зялёнае сьвятло

**Ад 22 траўня Ўкраіна адмяніла квоту на ўвоз беларускіх электралямпачак, што дзейнічала з жніўня 1999 г.** Берасьцейскі электралямпавы завод мог пастаўляць ва Ўкраіну не больш за 700 тыс. лямпачак у год. Украінскае Міністэрства гандлю таксама пагадзілася не абкладаць беларускія фосфарныя ўгнаеньні дадатковым мытам у 28%. Цяпер беларускі бок змагаецца за адмену ўкраінскага антыдэмпінгавага мыта на запалкі.

### Паліміраўцам далі акцыі

**Працаўнікам наваполацкага ААТ «Палімір» перадалі 0,01% акцыяў прадпрыемства.** Прадавалі акцыі на льготных умовах — па цане, на 20% ніжэйшай за намінал, што складае 3300 рублёў за акцыю. 99,9% акцыяў атрымаў канцэрн «Белнафтахім». 4 чэрвеня пройдзе першы аўкцыён, на які выставяць 43,19% акцыяў «Палміру» і «Нафтану».

### БМЗ: усё чыста

**Беларускі мэталюргічны завод атрымаў міжнародны і нацыянальны сэртыфікаты сыстэмы кіраваньня навакольлем.** Сэртыфікат дазволіць заваёўваць новыя рынкі, бо вытворчасьць ды прадукцыя заводу прызнаныя экалягічна чыстымі. Завод экспартуе 80% сваёй прадукцыі.

### «Трактар» жыве

**Пасьля доўгіх перамоваў з прадпрымальнікамі, адміністрацыя Заводзкага раёну сталіцы згадзілася адкласьці закрыцьцё рынку на стадыёне «Трактар» да 1 верасьня.** Чыноўнікаў спалохала пагроза бізнэсоўцаў выставіць «жывы шчыт», калі дэмантаж працоўных кропак пачнецца 19 траўня.

### Друкарні пашыраюцца

**Гарадзенская абласная друкарня аб'явіла тэндэр на набыцьцё друкарскай ратацыйнай машыны коштам 450 тыс. даляраў.** Грошы на яе выдаткавалі з дзяржаўнага ды абласнога бюджэтаў. Сёлета мусяць набыць ратацыйныя машыны для друкарняў у Берасьці ды Віцебску, аднак сродкаў хопіць толькі на дзьве машыны.

### Сувязь падаражэла

**«Белтэлекам» падвысіў тарыфы на паслугі сувязі ў сярэднім на 20%.** За мясцовыя размовы давядзецца плаціць 5,75 руб. за хвіліну.

### Адсяляліся

**15 траўня скончылася пасяўная.** Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы плянуюць сабраць 6,4 млн. тонаў збожжа ды 8,5 млн. тонаў бульбы, для чаго набудуць да жніва каля 2 тыс. новых камбайнаў.

**АК**

# Што такое беларускі сыр?

**Амаль кожная эўрапейская краіна мае хоць бы адзін традыцыйны нацыянальны гатунак сыру. Хто ня чуў пра ангельскія чэдар ды стылтан, галяндзкія эдам і гаўда, францускія ракфор ды камамбэр, італьянскія пармэзан ды гарганзолу? Наяўнасьць традыцыйнага нацыянальнага сыру, дый не аднаго — быццам пропуск у прывілеяваны клюб эўрапейскіх нацый. А што мы? Ці можам пахваліцца нацыянальнымі сырнымі традыцыямі?**



IREX-PROMEDIA

На жаль, наш сыр не пазнаюць у сьвеце. Нават прафэсіяналы сёньня прызнаюць, што амаль усе гатункі цьвёрдых сыроў беларускай вытворчасьці немагчыма адрозьніць адзін ад аднаго. Найперш праблемы з малаком, якога ў пэўныя сэзоны банальна не стае, ня кажучы ўжо пра стабільнасьць паказчыкаў якасьці, уніфікаваныя тэхналёгіі, адны і тыя ж фэрмэнты (амаль усе — з Маскоўскага заводу сычужных фэрмэнтаў — якая тут можа быць «сырная незалежнасьць»!), матэрыялы пакрыцьця і г.д. Невялікія варыяцыі ва ўтрыманьні вільгаці і тлушчу ў сухім рэчыве, рысунку і форме — ну, і ў тэрмінах дасьпяваньня — вось і ўсе адрозьненьні, няўлоўныя для сярэдняга спажыўца.

Нашыя паўночныя суседзі літоўцы дасягнулі тут нашмат большых посьпехаў. Яшчэ ў савецкія часы мала хто з турыстаў-менчукоў або камандзіраваных у Вільню вяртаўся адтуль безь якога-небудзь з тамтэйшых сыроў — з кменам, вэнджанага ці яшчэ зь якой-небудзь прывабнай рысай, на якую асьцярожныя беларуска-савецкія сыравары не маглі рашыцца. І сёньня літоўскія сыры — адзін з прадметаў нацыянальнай гордасьці незалежнай дзяржавы.

Цяпер амаль палова іх вывозіцца на экспарт. Як, зрэшты, і нашых. Але мы прадаём танны прадукт на рынак фактычна толькі адной замежнай краіны, а літоўцы — дарагі (параўнальна з уласным рынкам) і па ўсім сьвеце. У адны толькі Злучаныя Штаты летась было пастаўлена амаль 14 тыс. тон (прыкладна столькі мы экспартуем у Расею), што забясьпечыла літоўскаму сыру 4-е месца на амэрыканскім рынку — вышэй, чым у такіх традыцыйна «сырных» краін, як Галяндыя, Данія ды Швайцарыя. Нават з Эстоніі, колішняй савецкай лідэркі па вытворчасьці і спажываньню сыру, літоўскі прадукт выцясняе мясцовы, займаючы больш за траціну тамтэйшага рынку — калі не пад сваім сапраўдным «сьцягам», дык у выглядзе падробкі пад эстонскі, што пагражае банкруцтвам многім эстонскім вытворцам.

## Сыр пачаўся з Гарадзеі

100 гадоў таму немагчыма было правесьці выразную мяжу паміж «літоўскай» і «заходнебеларускай» традыцыямі сыраробства. «Літоўскай» называлі менавіта «заходнебеларускую». Іншая справа, што літоўцы ад таго часу пайшлі па шляху ўдасканальваньня гэтых традыцый, падкрэсьліваньня нацыянальных асаблівасьцяў, сэлекцыі ўнікальнага, арыгінальнага, высакароднага, у той час як мы — па шляху спрашчэньня, саветызацыі і халтуры. Зрэшты, хіба гэта тычыцца толькі нашага сыру?

Ва ўсіх савецкіх даведніках па гастраноміі пісалася, што радзімай клінковага сыру зьяўляецца Беларусь. Але традыцыі сыраробства з тварагу — агульныя для беларусаў, палякаў і літоўцаў. Проста нам, так бы мовіць, выдзелілі, як таму малодшаму брату, самую простую тэхналёгію. Дарэчы, літоўцы звычайны клінковы сыр называюць *Lietuviškas sűris*. Традыцыйным дадаткам да такога сыру — і ў нас, і ў літоўцаў, і ў палякаў — зьяўляецца кмен (радзей мак). Калі такі сыр хацелі захаваць надоўга, яго высушвалі да такой крамянасьці, што яго немагчыма было раскусіць ці нарэзаць скрылямі. Таму яго крэмзалі на як мага драбнейшыя кавалкі і ссалі як цукеркі ці церлі і ўжывалі як дадатак да розных страў. Гэта наш аналяг славутага пармэзану, італьянскага таркавага сыру.

Але ў сярэдзіне XIX ст. і да нас, прычым менавіта з Галяндыі, пранікла эўрапейская традыцыя фэрмэнтаванага, ці сычужнага сыраробства. Сычужны сыр атрымліваюць не з прасаванага тварагу, а з малака, што згортваецца пад узьдзеяньнем фэрмэнту хімазыну, які атрымліваецца з сычужнай часткі страўніка маладых цялятаў. Піянэрамі новай, дагэтуль невядомай вытворчасьці сталі шляхцянкі Наваградзкага павету. Незадоўга да скасаваньня прыгону і выбуху паўстаньня 1863 г. Эмілія і Марыя Брахоцкія з Гарадзеі рашыліся наладзіць масавую, у камэрцыйных маштабах, вытворчасьць «галяндзкіх» сыроў.

Каля 1859 г. невядомы сыравар, запрошаны Брахоцкімі з Галяндыі, прынёс у наднёманскі край тэхніку вырабу сыроў кшталту традыцыйнага галяндзкага сыру *эдамэр* (гал. *Edammer Kaas*). Новы гатунак сыру першапачаткова так і называўся: «брахоцкі». Вельмі хутка яго вядомасьць перасягнула ня толькі ваколіцы Гарадзеі, але і межы гістарычнай Літвы, так што яго пачалі называць *літоўскім*. Імклівай кар'еры новага сыру паспрыяла выгоднае геаграфічнае становішча Гарадзеі, разьмешчанай ля скрыжаваньня шашы Наваградак—Нясьвіж—Слуцак і чыгункі Масква—Варшава, якая пралегла праз гэтыя мясьціны ў 1871 г. Неўзабаве ў Варшаве і Вільні, у Санкт-Пецярбургу і Маскве, у Кіеве і Адэсе ўсталявалася мода на літоўскія сыры з Гарадзеі і ваколіцаў — досыць падобныя да эдамэру, але таньнейшыя — мода, якая пратрымалася некалькі дзесяцігодзьдзяў.

«Брахоцкія», ці літоўскія сыры былі шарападобнымі, як і эдамэр, вагой ад 2 да 4 кг, дасьпявалі досыць доўга — да 4 месяцаў — і вырабляліся як зь цьвёрдай скарынкай (такія сыры зьверху парафінаваліся), так і з адмыслова падцьвілай (гэтыя пакрываліся станіёлем — тонкай алавянай фольгай, бо алюміневай у тыя часы не было). Выраб іх ніколі ня быў «народным промыслам»: сыраварства на эўрапейскі кшталт было занадта складаным тэхналягічна ня толькі для парэформавага селяніна, але і для старасьвецкага шляхціча.

Менавіта Наваградзкі, а пазьней і Менскі паветы Менскай губэрні былі першымі асяродкамі новага сыраварства. У Віленскую і Ковенскую губэрню (а значыцца, і ў этнічную Літву) сычужны літоўскі сыр прыйшоў менавіта з поўдня, зь Беларусі. Папулярнасьць літоўскага сыру зафіксаваў у сваім допісе ў санкт-пецярбурскі тыднёвік «Край» у 1888 г. Францішак Багушэвіч: «Сёлетняя «Прамыслова-сельскагаспадарчая выстава» знаёміць з 270 экспанатамі, зь якіх… малочных прадуктаў 8 (пераважна сыр, так званы літоўскі, які 29 гадоў таму пачала вырабляць у Гарадзеі Брахоцкая)».

У міжваеннай Заходняй Беларусі асноўнымі гатункамі фэрмэнтаванага сыру былі літоўскія і наваградзкія. Пад апошнімі меўся мясцовы аналяг швайцарскага сыру Emmental, які ў Беларусі ўкараніўся дзякуючы найперш славутай малачарні графаў Храптовічаў у Мураванцы каля Шчорсаў. У сярэдзіне 1930-х літоўскія каштавалі ад 1.50 (гурт) да 2.40 (раздроб) зл., а наваградзкія ад 1.80 да 2.40 зл. (Для параўнаньня: у Наваградзкім павеце ў 1934 г. быў усталяваны мінімальны месячны заробак 50 злотых.)

Як сьведчыць адзін даваенны польскі мэмуарыст, «сыр «Літоўскі» — мяккі, вільготны, востры — у сваёй клясе ўпэўнена біў гумовы, моташны, ніякі галяндзкі сыр. Маляўнічы пятнічны кірмаш галяндзкіх сыроў у Алкмары насычаў зрок; польскі ж сыр «Літоўскі» насычаў смак».

У міжваеннай Заходняй Беларусі сыраварства было прыкметнай дэталлю эканамічнага ляндшафту. Продкі многіх эмігрантаў з Заходняй Беларусі былі сыраварамі. Сваю сыраварню, напрыклад, трымала маці вядомай грамадзкай дзяячкі беларускай дыяспары ў ЗША Ірэны Каляды-Сьмірновай з Падкасоўя Наваградзкага раёну. Бацькі выдатнага польскага гісторыка Аляксандра Гейштара, былога прэзыдэнта Польскай акадэміі навук, варылі сыр у Пласковічах за Клецкам. Продкі Марата Клакоцкага, рэдактара амэрыканскай газэты «Беларус», таксама мелі невялікую сыраварню ля Ваўкавыску.

## Сыраварства сёньня

Традыцыі беларускага сыраварства захоўваюцца, асабліва на поўначы беларускай часткі былой Віленскай губэрні. ААТ «Пастаўскі малочны завод» у канцы мінулага году другі раз запар стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Найлепшая прадукцыя году», хаця 10 гадоў таму той завод быў на мяжы ліквідацыі. Пакуль тут вырабляюць толькі паўцьвёрдыя сыры («Сулугуні», «Славянскі»), цэх па выпуску цьвёрдых сыроў толькі будуецца. Своеасаблівай візытнай карткай заводу лічыцца сыр «Раніца», які нідзе больш не вырабляюць, а прадаюць галоўным чынам у беларускай сталіцы. Прыемна, што афіцыйны сайт заводу — беларускамоўны (http://postavy.euro.ru/dairy.html), як і надпісы на этыкетках.

Кінуўшы дарэмныя спадзяваньні на паляпшэньне «закупачных цэнаў», шмат якія калгасы поўначы былой Віленшчыны пачынаюць ствараць свае міні-заводы па вытворчасьці сыру. У Пастаўскім раёне гэта калгас імя Суворава (Навасёлкі), які праславіўся на ўсю Беларусь сваёй страўсавай фэрмай і кісласьметанковым маслам, а ў Глыбоцкім — «Новы шлях» (Запрудзьдзе), які выбрабляе ў асноўным традыцыйныя баўгарскія сыры — вэнджаны баўгарскі сыр «Джыл» нядаўна прызнаны найлепшай закускай да піва 2002 г. у Расеі. Сыр «Сетаўскі» (названы ў гонар прыгожага мясцовага Сетаўскага возера) ахвотна закупляюць супэрмаркеты Масквы. 200 гадоў таму граф-дзівак з Паставаў Канстанцін Тызэнгаўз (1786—1853), арнітоляг, мастак-аматар і ледзь не мясцовы шаман, быў таксама і слынным на ўсю Літву ды Беларусь сыраварам.

Але як шкада, што наш сыр мала што памятае пра сваё мінулае! Няўжо ніхто не захоча ўваскрасіць літоўскі (а можа, лепш — Гарадзейскі?) і наваградзкі, за якімі больш за стагодзьдзе гісторыі? Ці больш сьціплыя, вядомыя калісьці толькі ў сваім рэгіёне, але ня менш смачныя і годныя? Забытыя літоўскія і наваградзкія сыры — ня проста эпізод эканамічнай гісторыі, але цэлы страчаны пласт нашай культуры.

Мо памятае нехта тэхналягічныя або эканамічныя падрабязнасьці ці проста нейкія фацэтныя эпізоды, зьвязаныя з сырам? Адгукніцеся, хто ведае нешта пра мінулае нашага сыру! Любая дробязь можа аказацца істотнай дэталлю мазаікі, якую яшчэ магчыма сабраць.

**Паводле «Рэгіянальнай газэты»**



**У Сярэднявеччы сыр выкарыстоўваўся падчас магічных рытуалаў, а ў Новы час — як ядры для гармат на ангельскім флёце.**

## 23 траўня пятніца

**● БТ**

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Паварот ключа». Сэрыял.
9.10, 17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял (ЗША).
10.00 Сад мары.
10.25 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Кухня КВК.
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.25 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Драма «Белае возера». («Беларусьфільм»).
15.20 Дакумэнтальны музычны сэрыял «Прыгадай пра будучыню».
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Вакол шпіёны». Мультсэрыял.
16.20 5х5.
19.05 Сямейная мэлядрама «Маладыя сэрцы» (ЗША).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Трагікамэдыя «Чорная кошка, белы кот».

**● СТВ**

5.30 Музычны канал.
6.00 «Вялікія грошы» зь Ігарам Патоцкім.
6.30, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.45 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.50, 19.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05, 18.10 «Менск і менчукі».
8.10, 23.55 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Выйсьця няма».
10.00 «Турпаход».
10.10 «Беларусь на крыжы стагодзьдзяў». Дак. фільм.
11.00 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.00 «Віно каханьня».
12.55 «У нас усе дома». Камэдыйны сэрыял.
13.50, 18.35 «Срэбранае вясельле». Тэлесэрыял.
14.40 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.45, 23.20 Праект «Адлюстраваньне»: «Спэцназ». Дак. фільм.
17:30 «Вуліцай Кірыла і Мяфодзія». Дак. фільм.
17.55 «Філярманічны тыдзень».
18.00 «Сьвецкая хроніка».
18.20 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.35 «Аўтапанарама».
20.50 Кіно: камэдыя «А ты зь якой плянэты?». ЗША, 2000.
23.05 «Навіны СНД».
0.05 Кіно: мэлядрама «Каханак».

**● Першы музычны канал**

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.50 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Прэм'ера АНТ: «Бяз тэрміну даўнасьці». «Сны пра нешта большае». Дак. дэтэктыў.
10.15 Шматсэрыйны фільм «Пад Палярнай зоркай».
11.10, 22.05 «Фабрыка зорак-2».
11.40 Сэрыял «Твінісы».
15.05 «Крылы».
15.30 «Геніі і зладзеі».
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Дак. фільм. «Антысьветы Андрэя Вазьнясенскага».
18.35 «Самі з вусамі».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.30 АНТ прадстаўляе. Прафэсійны бокс: «7 дзён — 7 баёў».
0.05 Камэдыя «Браты Блюз». ЗША, 1980 г.

**● РТР**

7.45 Тэлесэрыял «Ідыёт».
8.45 «Людзі і цені-2».
9.45, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сьвяточны канцэрт да 80-годзьдзя таварыства «Дынама».
21.05 Баявік «Мафія неўміручая». 1993 г.

**● НТВ**

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Найноўшая гісторыя: іншыя».
10.15 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога» (ЗША).
17.25 Каманда.ru.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Залатая калекцыя. Баявік «Заўтра ніколі не памрэ» (ЗША).
22.25 «Усё адразу!».

**● Культура**

15.10 «Урокі расейскай». «Усё пра каханьне...». Апавяданьні Н.Тэфі чытае Вольга Аросева.
15.30 С.Пракоф'еў. Канцэрт №2 для фартэпіяна з аркестрам.
16.05 «Са столі».
16.35 «Прабачце, што жыву».
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Час сабору». Дак. сэрыял. Фільм 4-ы. «Сьвята-Траецкі сабор Аляксандра-Неўскай ляўры».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «На Залатой сажалцы». Маст. фільм (ЗША, 1981).
21.25 Да 90-годзьдзя Мікіты Багаслоўскага. «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».

**● Эўраспорт**

9.30 Вэляспорт. Трэк. Кубак сьвету. Фінал. Перадача з Аўстраліі.
10.30 Футбол. Агляд матчаў чэмпіянату Эўропы сярод юнакоў. Паўтор.
11.00 Футбол. Легенды чэмпіянатаў Эўропы. Нямеччына, 1996. Паўтор.
12.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Чвэрцьфінал. Паўтор.
14.00, 18.45 Настольны тэніс. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя.
15.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 12-ы этап. Паўтор.
16.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 13-ы этап. Жывая трансьляцыя.
21.00 Самы дужы чалавек. Перадача з Гішпаніі.
22.00, 23.00 Кікбоксынг. Паўтор.
0.15 «Формула». Часопіс.
0.30 Ралі-рэйд. Перадача з Партугаліі.
1.00 Спарткары.
1.15 Матаспорт. Перадача з Францыі.
1.45 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

## 24 траўня субота

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!». Забаўляльная праграма.
9.35 Экран індыйскага кіно. «Пагібель сьвята». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.30 Тэлевізійны Дом кіно. Зоркі кінафэстываляў.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Жодзішкі. На стыку рэлігій і дзяржаў».
12.55 Сола для дэбютанта. Арцём Шышкоў (скрыпка).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 Дак. сэрыял «Пары і дуэты-2».
14.00 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Сем футаў пад кілем». Відэафільм АТН.
15.35 Кухня КВК.
15.50 «Містэр Бін». Камэдыйны сэрыял.
16.15 Гістарычны фільм «Я, Францыск Скарына». («Беларусьфільм»).
17.50 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
18.25 Футбол. Кубак Беларусі. Фінал. Жывая трансьляцыя.
20.30 Трэці тайм.
20.40 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Выпадковы і жорсткі».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.00 Міжнародны конкурс песьні «Эўрабачаньне-2003». Жывая трансьляцыя з Рыгі.
1.00 Камэдыя «Афэрысты».

**● СТВ**

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Ажылыя драконы» з цыклу «Паляўнічыя». Дак. фільм.
7.30, 15.45 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял. Заключная сэрыя.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50, 19.50 «СТВ-спорт».
9.00 «Рэактыўны бокс».
9.15 «Адпачывай».
9.25 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.50 Кіно: камэдыя «Сьцюарт Літл». ЗША, 1999. 1-я частка.
10.45 «Разам».
11.15 «Рамонт».
11.30 «Філярманічны тыдзень».
11.35, 20.10 Тэлесэрыял: «Месца сустрэчы зьмяніць нельга». СССР, 1979.
12.45 «Плянэта людзей».
13.05 Кіно: трылер «Двайнік».
14.45 «Дружная сямейка». Камэдыйны сэрыял.
16.15 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял.
16.40 «Запрашаем паскардзіцца».
16.50 «Аўтапанарама».
17.10 Кіно: камэдыя «Банзай!». Францыя, 1980.
19.30 «24 гадзіны».
21.20 Кіно: камэдыя «Кокан». ЗША, 1985.
23.25 «Навіны СНД».
23.40 Кіно: фільм Мілаша Формана «Вальмон».

**● Першы музычны канал**

8.00, 12.30 Рухач.
12.00 «Сіла цягі». Аўтапраграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00 Навіны.
8.10 «Ералаш».
8.25 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 Крэмль-9. «Сьвятлана Сталіна. Уцёкі зь сям'і». 2-я сэрыя.
11.10 «Вяртаньне дадому. Рэнат Акчурын. Андыжан».
11.50 Сьмехапанарама.
12.35 «Падарожжа натураліста».
13.05 «Тайна неўміручасьці». Дак. фільм.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Расейская рулетка».
15.00 Выратавальнікі. Тэрміновы выклік.
15.30 Дэтэктыў «Зьмеялоў».
17.15 Канцэрт «Маладосьць мая...». Памяці У.Мулявіна.
19.00 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
21.55 «Што? Дзе? Калі?»
23.20 АНТ прадстаўляе. Прафэсійны бокс: «7 дзён — 7 баёў».
23.40 Баявік «Дзейнічай, сястра!».

**● РТР**

8.45 Ранішняя пошта.
9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Простая гісторыя». 1960 г.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. ЦСКА — «Тарпэда-Мэталюрг» (Масква). Жывая трансьляцыя са стадыёну «Дынама».
17.00 Мая сям'я.
18.00 Аншляг.
19.00 Весткі.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Сусьветнае кіно. Прэмія «Оскар». Маст. фільм «Матрыца» (ЗША). 1999 г.
22.55 Камэдыя «Герой яе раману». 2001 г.

**● НТВ**

9.05 Кулінарны паядынак.
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 Сёньня.
11.15 «Прафэсія — рэпарцёр».
11.40 Служба выратаваньня.
12.15 Камэдыя «Міміно».
14.05 Свая гульня.
15.20 Спорт. «Лята 6 з 49».
15.25 «Жаночы погляд».
16.05 Мэлядрама «Зладзейка».
18.00 Найноўшая гісторыя: Санкт-Пецярбург. Пасьведчаньне на правы жыхарства.
18.45 Дэтэктыў «Сышчыкі-2: пайсьці і не вярнуцца».
20.00 «Асабісты ўклад». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
21.05 Прэм'ера. Маст. фільм «Нэл» (ЗША).
23.20 Супэрбокс. Оскар Дэ Ла Хоя супраць Гектара Камача.

**● Культура**

11.10 ГЭГ.
11.25 «Графаман».
11.50 Прагулкі па Брадвэі.
12.15 Дзіцячы сэанс. «Чароўная лямпа Алядына». Маст. фільм.
13.35 «Дар дажджоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 7-ы. «Шыр. Рака ўрадлівасьці».
14.05 Памяці Алега Яфрэмава. «Трэба кахаць».
14.45 «Рамантыка рамансу».
15.25 «Вясельле Крачынскага». Прэм'ера тэлевэрсіі спэктаклю.
18.25 Магія кіно.
18.55 «Сфэры».
19.35 «Дзіця асьветы». Тэлесэрыял (Францыя, 2002).
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 Дзень славянскага пісьменства і культуры. «Напачатку было Слова».
23.00 «Недатыкальны». Дак. фільм.

**● Эўраспорт**

9.30 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Чвэрцьфінал. Паўтор.
11.30 Настольны тэніс. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя.
13.45 Матагонкі сэрыі Гран-пры. Францыя. Жывая трансьляцыя.
16.15 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 14-ы этап. Жывая трансьляцыя.
18.30 Настольны тэніс. Чэмпіянат сьвету.
19.30 Супэргоначны ўік-энд. Жывое ўключэньне з Брно.
20.00 К-1. Сусьветнае Гран-пры. Перадача з Лас-Вэгасу.
22.00 Сьпідвэй. Гран-пры Польшчы.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
0.45 Баявыя майстэрствы ў залі «Бэрсі». Паўтор.

## 25 траўня нядзеля

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.05 Альхімія слова.
9.10 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.40 Экран індыйскага кіно. «Пагібельнае сьвята». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.45 Наша спадчына. «Ратушы Беларусі». 2-я частка.
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лята».
13.40 «Сьвятло далёкай зоркі. Барыс Райскі».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 Дак. сэрыял «Піянэры эгіптазнаўства».
15.55 Гандбол. Чэмпіянат сьвету. Плэй-оф. Жанчыны. Беларусь — Славенія. Жывая трансьляцыя. У перапынку (16.40) — «Маршрут №...».
17.35 Кліп-абойма.
18.15 Маст. фільм «Чарадзейства індзейцаў». (Італія—ЗША).
19.30 Камэдыя «Жаніх з Маямі».
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.15 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Васіль Жыраў — Джэймз Тоні. Трансьляцыя з ЗША.
23.10 Крымінальная драма «Час шалёных сабак» (ЗША).

**● СТВ**

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Выратавальнікі». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.05 «Менск і менчукі».
9.15 «Партрэт у інтэр'еры».
9.30 «Аўтапанарама».
9.50 Кіно: камэдыя «Сьцюарт Літл». ЗША, 1999. 2-я частка.
10.40 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
11.05 «Добры дзень, доктар!».
11.20 «Сьвецкая хроніка».
11.30, 20.35 Тэлесэрыял: «Месца сустрэчы зьмяніць нельга». СССР, 1979.
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.05 Кіно: мэлядрама «Вочы анёла». ЗША, 2001.
15.30 «Дружная сямейка». Камэдыйны сэрыял.
16.30 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял.
17.00 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «Усё для цябе».
18.45 «168 гадзін».
19.30 «Пакуль гарыць сьвечка».
20.00 «Асабісты інтэрас».
21.50 «Гульнявы рэфлекс».
22.05 Кіно: камэдыя «Кокан-вяртаньне». ЗША, 1988.
0.05 «Навіны СНД».
0.20 Кіно: трылер «Споведзь утрыманкі».

**● Першы музычны канал**

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 «Ералаш».
8.25 Служу Айчыне!
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
11.55 Прэм'ера. Джэймз Кемэран. Вяртаньне да «Тытаніку».
12.25 «Клюб падарожнікаў».
13.05 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.00 Навіны (з субтытрамі).
14.10 «Валадар смаку».
15.05 Ударная сіла. «Бескантактная вайна».
15.35 Ток-шоў «Выбар».
16.15 «Вялікія бацькі».
17.05 Нядзельны «Ералаш».
17.40 Жывая прырода. «Прагулка з дыназаўрамі». «Нашчадкі дыназаўраў».
18.40 «Ванільна-клубнічнае марожанае». Баявік.
20.30 Контуры.
21.10 АНТ прадстаўляе: «Беларусы ў Афрыцы. Ралі па Сахары». Частка 2-я.
21.30 Баявік «Самалёт прэзыдэнта».
23.45 АНТ прадстаўляе. Прафэсійны бокс: «7 дзён — 7 баёў».
0.05 Часы.
1.05 Вынікі Канскага кінафэстывалю ў праграме «Ціхі дом».

**● РТР**

9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.50 «Гарадок».
10.20 Парад камэдый. Фільм «Пякельны хмарачос» (Францыя). 2001 г.
12.10 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Сьвет на мяжы.
13.55 Пакой сьмеху.
14.55 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Масква). Жывая трансьляцыя з стадыёну імя Э.Стральцова.
16.55 Камэдыя «Бумэранг» (ЗША). 1992 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Сусьветнае кіно. Маст. фільм «Вясельле». 2000 г.

**● НТВ**

8.55 Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца». 8-я сэрыя (ЗША).
9.50 «Расьліннае жыцьцё».
10.30 Вы будзеце сьмяяцца!
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 Сёньня.
11.15 «Уплыў».
12.05 Дэтэктыў «Перахоп».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 Гуляем у «Кено».
15.25 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.50 Прыгодніцкі фільм «Робін і Мэрыян» (ЗША).
18.50 Дэтэктыў «Сышчыкі-2: пайсьці і не вярнуцца». Частка 2-я.
20.00 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
21.30 Фільм тыдня. Прэм'ера. Трылер «Сапраўднае злачынства» (ЗША).
0.05 Сэрыял «Клан Сапрана» (ЗША).

**● Культура**

11.05 «Рыцары сьмеху».
11.35 Нядоўгія гісторыі.
11.50 Прагулкі па Брадвэі.
12.15 Дзіцячы сэанс. «Канёк-Гарбунок». Мультфільм.
13.30 «Дар дажджоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 8-ы. «Сэнд. Рака дастатку».
13.55 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Душа Пецярбургу». Дак. фільм.
14.50 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
15.15 «У сьвеце танцу». «Шчаўкунок». Харэаграфія Марыса Бэжара.
17.00 «Сяргей Эйзэнштэйн. Аўтабіяграфія». Дак. фільм.
18.30 Сьмеханастальгія.
18.55 «Дом актора». «Дом, які пабудаваў Эскін...».
19.35 «Дзіця асьветы». Тэлесэрыял (Францыя, 2002).
20.30 «Болей чым каханьне».
21.10 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.35 «Культ кіно». «Ці памятаеш Долі Бэл?». Маст. фільм.
23.25 Джэм-5.

**● Эўраспорт**

9.30 Супэргоначны ўік-энд. Брно. Паўтор.
10.00, 19.00 Сьпідвэй. Гран-пры Польшчы. Паўтор.
11.00 Мота-гран-пры. Францыя. Жывая трансьляцыя.
16.15 Супэргоначны ўік-энд. Жывы рэпартаж з Брно.
17.15 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 15-ы этап. Жывая трансьляцыя.
18.30 Настольны тэніс. Чэмпіянат сьвету.
20.00 Супэргоначны ўік-энд. Выніковы агляд.
21.00 Бокс.
23.15 Наскар. Перадача з ЗША.
0.15 Індыкар. Перадача з Індыянапалісу.

# Тыдзень з Кірчуком



Пры канцы траўня ў Менску адбудуцца аж тры імпрэзы з удзелам Івана Кірчука, лідэра этна-трыё «Тройца».

**23 траўня** адбудзецца прэзэнтацыя яго сольнага альбому «Спадчына вёсак, што загінулі». Гэта праграма была запісаная ў Галяндыі чатыры гады таму і выдавалася на касэтах малым накладам, а цяпер во зьявіўся дыск. У краме «Містэрыя гуку» (вул.Няміга, 12) можна будзе пачуць сёе-тое з гэтага альбому ў жывым выкананьні, а таксама ўзяць аўтограф у фольклегенды. Пачатак а 18-й.

**26 траўня** ў КЗ «Менск» можна будзе пачуць самую новую сольную праграму лідэра «Тройцы» пад назвай «Варажбіт» — фальклёрную фантазію пра дух старажытнага народу. Варажбіт — гэта той, хто сваімі сьпевамі і замовамі бараніў чалавека ад злое сілы. У руках Варажбіта нават камяні ажывалі і сьпявалі. Пачатак у 19.00.

**27 траўня** ў клюбе «Тунэль» зайграе ўся «Тройца». Этна-трыё прэзэнтуе праграму пад назвай «Новае і найлепшае». Канцэрт пачнецца ў 20.00. Цана квіткоў — 7000 руб. (у папярэднім продажы) і 9000 руб. (у дзень канцэрту).

**Сяргей Будкін**

## Тодар&Камоцкі

**6 чэрвеня** ў Палацы вэтэранаў (вул.Янкі Купалы, 21) адбудзецца прэм'ера праграмы Зьмітра Вайцюшкевіча на вершы Алеся Камоцкага. У праграме таксама песьні з супольных музычных праектаў: «Народны альбом», «Сьвяты вечар», «Я нарадзіўся тут», праекту на вершы Ўладзімера Караткевіча. Пачатак а 19-й. Квіток каштуе 5 тыс. рублёў. Даведкі і акрэдытацыя журналістаў па т.: 8-029-649-08-88, пэйдж.: 211-85-85 (аб. БМА).

**ВС**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# З запазухі

## Рыгор Барадулін

### Суладзьдзе

Рос я ў тыя часіны, калі яшчэ Біблія была як бы разьлітая ў побыце, у паветры, ва ўсім навакольлі.

Хрысьціянства й паганства жылі як добрыя суседзі, як не такая ўжо далёкая радня.

Грымеў гром, мама суцішана казала: «Божанька гразіцца. Значыць, нешта ня гэтак робім. Бо Божанька ўсё бачыць».

Курка чысьціла дзюбку аб зямлю. Мама пakaзвала: «Глядзі, курка й тая, як пад'есьць, ксьціцца, Богу дзякуіць».

Біблія цытавалася дужа адвольна ў людзкой гаворцы.

Гэта ж мама, заходзячы ў хату зь лютага марозу, выгуквала, выхуквала: «Эгіпэт! А ў нас у хаце яшчэ Бог жывець».

Далёкія адгалоскі Бібліі.

На Каляды ў ясьлі карове ці каню клалася нешта ласейшае, ядлівае — мурог, канюшынку. Мама паўтарала: «У ясельках жа Хрыстос нарадзіўся…»

Грамнічнымі зёлкамі ўгожвалі абразы.

Вужу, што недзе пад ганкам гаспадарыў, не забываліся наліць сьвежага малачка.

Пакланяліся Звышняму ў тварбе ягонай. Бяз Бога не да парога.

### Мамнікі

Куды б ні кідаў мяне сьвяты Марцін — апякун вандраваньня, паўсюль бачыў я матуль, якія гадавалі будучы дзень, дзень наступны.

У Нью-Ёрку, які марна імкнуўся ўперціся ў неба пыхлівымі хмарачосамі, маладая амэрыканка вяла на павадку шлеек будучага Вашынгтона. Уся яна была з дабрабыту, але найболей сьвяцілася мацярынствам.

У Індыі, у Агры, якая падкрэсьлівае сваім найменьнем сувязь зь зямлёй, галазадзенькае немаўлятка надта ж смачна смактала матчыны грудзі. Магчыма, будучы Рабіндранат Тагор браў сілу, клёк зямлі матчынай.

У незьлічонаселеніцкім, ніколі незьбязьлюджаным Пэкіне за мамай бег з разрэзам на срачцы маленькі Ду-Фу. Перад ім былі тысячагодзьдзі матчынага слова, за ім таксама — тысячагодзьдзі.

На вушацкай зямлі сына, які ня можа ні хвіліны пабыць бяз маці, як у нас кажуць, гоніцца за маткай, называюць мамнік. Яно ўсе сыны чалавечыя — мамнікі. Не выпадкова мачыху называюць халоднай маткай.

І не на трох кітах трымаецца зямля — на трох паравінах матчынага веку.

**Ад матулі**

З маленства, юнацтва да сталасьці
Пачынаецца нашага сэрца хада.
Гэта трывога матуліна
Кнігаўкай сталася,
Каб вечна адводзіць
Бяду ад гнязда.

### Дарога на Лепля

Ля Лепля дарога старая. Яшчэ брукаваная. Уздрыглівая для калёсаў летам, зімой запынлівая для саней сваімі вытаялымі камянямі.

Едзеш па зімавой лепенскай (як у нас казалі) дарозе, падкутай лядком.

Завея курыцца. Цяпер здаецца, што гэта дымок над каваю. А калі паехаць у думках назад, дык гэта пара над мешанкай ці над вотрынамі, залітымі нішчымным варам.

Выгінастая алешына, што зь нейчага возу ўпала, рудзеецца сьвежым зрэзам, нібыта гадзюка з адцятай галавою.

Маладзіца едзе ў развалках. Просім праехацца перад кінакамэрай. Пытаецца, а ці будзе знатка, што яна ў сьвякроўкі першаку выпіла?

Возера Ворань. Як аб'інелае ворынава крыло. Можа, і праўда тут воран да ўсходу сонца ў чысты чэцьвер купаў сваіх варанятак дый пер'іну пакінуў на крумкліваe найменьне возеру. Ці руплівы аратай радаваўся пагодліваму сьвітаньню й выгукнуў: «Во рань!»

Вёска Юркоўшчына. Сюды мама пасьля вайны хадзіла шукаць карову нашую Лісіцу, якую забралі падчас блякады.

Старалепля. Недалёка ад дарогі Галодны магільнік. Чаму мяноўна гэтыя названы галодным, невядома. Бо ўсе магільнікі галодныя.

Старалепля. Тут недзе быў канцлягер. Маладзіцы, сабраўшы ў хатульскі тое, што мелiся ў іх забраць немцы ды партызаны, хадзілі й стаялі каля калючай агароджы. Прызнавалі за сваіх мужыкоў і сыноў палонных, якім не было куды йсьці, бо былі яны аднекуль здалёку. А на пачатку вайны немцы адпускалі палонных дахаты, да маткі zuruk-zuruk. Яйкі й сала бралаахова ў даніну з маладзіцаў, у якіх былі спагадлівыя сэрцы.

Дарога на Лепля — вяртаньне ў маленства.
На Лепля дарога старая
Яшчэ йдзе стараной лясною
І разам са мною
Сама сябе ўспамінае...

### Паслухаем!

Гэта трэба ўслухацца, абсмакаваць кожнае слова на кожную зьяву, на кожную праяву.

Плот абярнуўся, абваліўся й разбурыўся.
Града дроў грымнула.
Хата рухнула.
Рухнула ўсё (усё нажытае прапала).

### Малако

Малако — мамка, а сала — ямка.
З малачком і зямелькі глынеш.
Па малачку ног не павалаку.
Масла пагасла, малако паехала даляко.
Малако састоенае ўчарашняе (паўднёвішняе), а гэта ўжо сасваталася, зажанілася (пачало ўкісаць).
Малако яшчэ не трасецца (ня ўкісла).
Малако сьселася ўжо, збрызла.

### Жыта

Рунь зазелянела, адскочыла (як адскочыць, так і зазелянеіць).
Ужо большае — варона хаваіцца.
Жыта ў пуку.
Высыпаіць, красуіцца.
Ужо ў жыці пяткі наліліся (бярэцца на зярно).
Налілося.
Як налiецца і пачынаіць сьпець.
Жыта ўжо забурэла.
Высьпела.

### У гародзе

Лапка кропу, пер'іна часныку, каліва бульбы, вочка парэчкі, вянок цыбулі, хвост морквы. Бульба ўжо як галубінае яечка. Бульба выросла ў аглоблі.

### Каму пазваніць?

Дыхае вадой веснавою, патыхае смыленьнем ад спаленага сіўца, які па-вушацку завецца сьвінухай. Чарнеюцца выпаліны. Іх заглушае зялёным колерам перажоўклая трава. Выцьвілы да белаты цьвет дзядоўніку зьлівацца з выцьвілым лапікам сьвінухі. Дудзьдзё дзядоўніку нэрвова зумкае. Ля возера на прыслонку прыгрэўся вуж. Ледзьве падышоў, пацёк уніз у чарнату чарназёму раўчуком бліскуча-чорным.

На таплявіне, дзе некалі манумэнтальны Янка Брыль пераносіў па зыбаўцы фальстафаватага Ўладзімера Караткевіча, а той, зь ніколі не пагаслай цыгарэтай у зубах, разгойдваючыся, як у сядле, з аршанска-ўэльскай іроніяй цікавіўся: «Янка, ці ня цяжка табе?» — і зьнізу чуў адказ канкрэтны: «Замаўчы, а то скіну». Дык вось на той таплявіне і сёньня вязка, мокра, невылазна.

На месцы, дзе некалі стаялі лодкі, толькі высечаны парасьнік на дровы ды на тычкі, каб пазначыць соткі, якім надзялілі вушацкіх мастачкоўцаў.

Падыходзіць дзядзька ў ботах і шапцы, кажа, што нічога няма і рыба зьвялася. Няўжо рыб'ю матку вылавілі? У яго, кажа, лодка была, дык на дніўшчы, калі выцягнуў лодку на бераг, шчэнь разьвяла агонь. Дзядзька кажа, што далі дзесяць сотак (дзякуй Богу, што ня дзесяць гадоў), а на справе яно болей выйшла. Бо ў гарадзе сорак гадоў бульба па бульбе — зьвялася. Тут, можа, гады два пародзіць, а там бадай што давядзецца зьбірацца на паповы сані. Але па-гаспадарску (што значыць сваё!) перамервае грунтоўнымі крокамі доўжкі, аднізу пачаў і зьнік за пагоркам.

Жабы, няйначай баючыся СНІДу, нацягваюць нешта гумовае — да холаду рып ідзе па вадзе.

Ля берагу, воддаль ад мяне, стаіць па плечы ў вадзе бутэлька з-пад ліманаду, але зь невыводным гарэлачным духам: акругліла пасінелы рот і гаворыць: «Усіх уцягну-у-у». Вецер, які набяжыць, хіба што зможа дадаць моцы яе голасу.

Пэргамэнтна-сухі — леташні чарот.

Сьмялеючы, аер пачынае паказваць халадам зялёны язык.

Самаробным двухлязовым сьцізорыкам, які знайшоў летась такой паравінай ля затокі каровінай, што ратуе ў паўдзён ад гізу, выразаю сабе пасашок зь сьсечанай алешыны.

Сіла такая ідзе ад вады, што бор на тым беразе адхінуўся да хрумсту ў зацёклай сьпіне, ажно павяло зялёны.

У кішэні знаходжу дзьве капейчыны. Каму пазваніць? Хіба самому Госпаду, каб падзякаваць за вясну і за Ваўчэнскае возера…

### Хмыр

Летняя нядзеля ў яшчэ нятлумным Менску сямідзясятых гадоў.

У шапіку «Саюздруку» сядзіць прадавіца. Чаргі ніякой. Гутарыць з сваёй знаёмай.

Падыходжу. Бачу «Китайско-русский словарь». Прашу паказаць. Купляю невялічкі кішанькова тлумачнік.

Прадавіца, забыўшыся, што стаю побач, сваёй сяброўцы:

— Думала, ніякі дурань ня купіць, аж апошні забралі.

А ў тыя часы хадзіў жарт пра танны спальны гарнітур (з мэбляй было туга) коштам дзьвюх пляшак гарэлкі. Калі пыталіся, чаму такі танны, адказ быў просты — дзьве цыноўкі й партрэт Мао.

Еду я сабе дамоў у бок Юбілейнага рынку. У тралейбусе яшчэ двое. Праяжджаем каля турмы па вуліцы Валадарскага. Адзін кажа другому:

— Тут я двойчы сядзеў.

Другі кажа пра іншую турму.

Раптам позіркі іхныя пападаюць на мой разгорнуты тлумачнік. Першы, што двойчы сядзеў у турме на горцы, ня выцерпеў і ўголас свайму сябру кпіць:

— Ты паглядзі на гэтага хмыра. Корчыць морду разумнага, быццам па-кітайску разумее.

Хоць турма ў пэўнай прафэсіі — унівэрсытэт, але спадарожнікі мае ня ведалі, што такое транскрыпцыя.

### Каб разьмяняць...

Старая просіць Бога, каб даў яшчэ чатыры гады пажыць. У яе пытаюцца, чаму якраз чатыры. Тлумачыць:

— Каб соцэньку разьмяняць.

**Працяг будзе.**

# Мастацтва з «трыма

**Спэктакль Генадзя Мушперта «Самотны Захад» паводле п’есы Марціна Мак-Донага, пастаўлены ў Гарадзенскім абласным драматычным тэатры, стаўся самай скандальнай прэм’ерай сэзону. Паўмесяца (з 17 красавіка) вырашаўся ягоны лёс. Нарэшце, 4 траўня на глядацкай канфэрэнцыі, дзе сабраліся пераважна людзі, запрошаныя аблвыканкамам, было вырашана: пакуль рэжысэр не папрыбірае з тэксту «вульгарнай лексыкі», пастаноўкі гледачы ня ўбачаць. Не дапамаглі й спасылкі на аўтарытэт Каралеўскага тэатру ў Лёндане, штатным драматургам якога ёсьць Мак-Донаг і дзе ў 1996 г. адбылася прэм’ера спэктаклю.**


ВІКТАР СТРАЛКОЎСКІ

На «К’ёджэўскіх перабрэхах» таксама лаяліся, але спэктаклю не забаранілі

Былы загадчык літаратурнай часткі гарадзенскага тэатру лялек Юры Гумянюк згадвае, што гэта ня першая забарона спэктаклю ў Горадні: «У 1998 г. забаранілі спэктакль лялечнага рэжысэра Аляксея Ляляўскага «Ліпавічкі». Пастаноўка была зробленая ў жанры сац-арту, і ў ёй выкарыстоўваліся герб, музыка гімну РБ. Чыноўнікам гэта не спадабалася». У «Самотным Захадзе» палітыкі няма. Проста чыноўнікі палічылі вульгарнымі словы кшталту «гаўна». Гарадзенскі рэжысэр Генадзь Мушперт на закіды абласных чыноўнікаў рашуча заўляе: «Я не зьмяню ніводнага слова, бо гэта пярэчыць мастацкай задуме». Яго можна зразумець: выразы герояў спэктаклю і блізка не параўнаеш з тымі, якімі перасыпаныя галівудзкія фільмы. Расейскія тэлеканалы таксама ўсё менш «фільтруюць словы».

Дык ці можна ўжываць табуяваную лексыку ў мастацкіх творах, у газэтах, на тэлеэкране?.. Адміністрацыйны кодэкс Беларусі (арт.156) адназначна характарызуе «нецэнзурную лаянку ў грамадзкіх месцах» як дробнае хуліганства і пагражае за гэта карай: дзьвюма базавымі адзінкамі штрафу, папраўчымі работамі на тэрмін ад аднаго да двух месяцаў з утрыманьнем 20% заробку альбо арыштам да 15 сутак. Калі б гэты артыкул абавязкова выконваўся, на адных штрафах можна было б падтрымліваць бюджэт Гарадзенскай вобласьці. Але самі ж «ахоўнікі парадку» мацюкаюцца так, што вушы скручваюцца. Калі ж браць мастацтва, дык Уільям Бэроўз, Генры Мілер, Эдуард Лімонаў і Адам Глёбус не адбыліся б як літаратары, калі б не ўжывалі «брудных» выразаў.

## «Жарснай папеўкай грэліся...»

«Людзям, якія ўжываюць у сваіх творах гэтую лексыку, я магу параіць: хай пашукаюць падобныя выразы ў клясыкаў — Коласа, Мележа, Чорнага, Брыля, — кажа паэт Ніл Гілевіч. — Гэтыя словы можна выкарыстоўваць толькі ў фальклёрных запісах, дый там яны трыма кропачкамі абазначаюцца». Яго падтрымлівае паэт Генадзь Бураўкін: «Вядома, бываюць экстрэмальныя сытуацыі, калі не выбіраеш словаў. Але чалавек культурны будзе старацца выбіраць заўжды. Калі на экран, на тэатральную сцэну вылазіць нешта непрыстойнае, дык гэта не дэмакраты-

# Хрэсьбіны мацюком

Усеагульная звычка лаяцца — хросьніца сталінскага раю і хрушчоўскае адлігі, калі на волю зь лягераў ды спэцпасяленьняў хлынулі дзясяткі тысячаў «зэка» (і ня толькі «кліенты» 58-га артыкулу). Таксама лаянка — стрыечная пляменьніца савецкага войска, дзе «матам гавораць», і г.д., і г.д. Лёгка звальваць уласную загану на старонькую злую сілу. Маўляў, прыйшлі страшныя расейцы й прыахвоцілі цнатлівых беларусаў да мацюкоў. Як самі расейцы часам вінавацяць татара-манголаў, ад якіх, нібыта, ёсьць пайшла мова мацерная. А насамрэч звычка брыдка лаяцца — дачка нашага канфармізму, жаданьня «не выдзяляцца» і ў адпаведным асяродзьдзі гаварыць мовай, таму асяродзьдзю зразумелай.

У Беларусі паралельна існуюць дзьве лаянкі — свая і расейская. І сказаць «бадай цябе халера» або нават «ідзі тваю каламашку» нашмат больш прыстойна і літаратурна, чым вылаяцца «па-тмутараканску». А замест пашыранага расейскага слова з трох літараў можна досыць легальна ўжываць беларускае зь пяці. Цікава, што сугучную гэтаму беларускаму зь пяці мянушку меў бацька Якуба Коласа Міхал. Мо нічога фалічнага і не было ў тым зернебабовым слове «струк», хоць падазрэньне такое ёсьць — надта ж уедлівы, кажуць, ён быў лясьнік. Дый дзяцей вунь колькі меў.

У хамскай сыстэме савецкіх іерархічных адносінаў, што працягвае жыць у незалежнай Беларусі, мат ёсьць адзнакай вышэйшасьці. Начальнік можа цябе аблаяць, а ты яго — не. І чым больш жорсткая сыстэма падпарадкаваньня ў той ці іншай сфэры, тым больш пашыраная там лаянка, тым важнейшую ролю яна адыгрывае. Напрыклад, сельская гаспадарка, што трымаецца болей на страху, чым на рэальнай выгадзе тых, хто ў ёй працуе, без мацюкоў папросту стане. Як той калгасны конь, што не кранецца зь месца, пакуль ня скажаш «чароўнага слова».

І перайначыць людзей вельмі цяжка. Адзін новапрызначаны старшыня «мёртвага» калгасу за паўмесяца знайшоў грошы на заробкі працаўнікам. Наступныя паўмесяца работа стаяла з прычыны глябальнага запою апошніх. Тады ў ход пайшла лексыка. Кіраўнік крычаў і гнуў засвоеныя ў часы камсамольскае маладосьці страшныя мацюкі, не зважаючы на жанчын і дзяцей. Праца наладзілася — да наступнага заробку. Пасьля паўтарылася тое самае. Чалавек плюнуў на калгас ды распачаў уласны бізнэс.

Лаянка дапамагае круціцца і колцам уладнае вэртыкалі. Адзін райвыканкамаўскі начальнік падчас сустрэчы з дырэктарамі школаў вельмі экспрэсіўна выказаў заклапочанасьць станам школьных прысядзібных участкаў і платоў. Пасьля адна дырэктарка — ціхая, выхаваная жанчына, — распаўсюджваючы навокал пах валідолу, увайшла ў школьную бібліятэку і каротка пераказала пэдкалектыву і тэхпэрсаналу асноўныя ідэі вэртыкальшчыка. Тымі ж словамі… У гэтым сэнсе прыемна ўражвае самая макаўка вэртыкалі. Якой бы сэлектарнай ні была нарада, кіраўнік дзяржавы ніколі не мацюкнецца на сваіх нядбалых падначаленых, якім дае дождж, бэнзын і запчасткі. Хоць лексыкай відавочна валодае — калі ўлічыць салідны досьвед працы на разнастайных савецкіх кіраўнічых пасадах.

Асобная гаворка пра войска. Бяз лаянкі яно страціла б абараназдольнасьць, бо ягоныя падразьдзяленьні, з генэралітэтам уключна, не змаглі б камунікаваць між сабой. Неяк начальнік вайсковай катэдры, што гадоў дзесяць камандаваў танкавым палком у Сібіры, надумаўся прачытаць студэнтам лекцыю пра патрыятызм. Шкада было глядзець. З аглядкі на тое, што ён ня «ў дзікіх сьцяпях Забайкальля», намагаўся генэрал кантраляваць сябе, глытаючы словы-зьвязкі, якімі стракацела ягоная мова: «Гэта няпраўда-б, што наша краіна ня мае-б ядравай зброі-нах! У кожным батальёне ёсьць пушка-б, гаўбіца-нах, якую чым-б зарадзіш, тым янаётм і стрэліць-б...»

Міліцыянты розьняцца ад вайскоўцаў тым, што лічаць лаянку сваім манапольным правам. Калі ў адказ на міліцыянтава «Атайдзіце, ..., на пяць мэтраў, ...!!!» пацікавіцца, чаму гэта ён лаецца матам, можна трапіць у пастарунак. У пратаколе напішуць «Нецэнзурна выражаўся» і дадуць штрафу.

Калі лаянка ўелася ў гаворку, ёй цяжка ўжо даць рады. Гэта прасьцей апярэдзіць, чым лячыць. І нацыянальны арганізм вынайшаў арыгінальную прышчэпку ад лаянкі. Ці ня ў кожнай вёсцы ёсьць чалавек, які вучыць малых дзяцей самым брыдкім словам — каб гэта ў іх «перайграла». Тую практыку выпрабаваў на сваёй сям’і й адзін былы дэпутат Вярхоўнага Савету. Стаўшы дарослымі людзьмі, ягоныя дзеці гавораць культурна. Цяпер былы дэпутат займаецца адпаведным выхаваньнем унукаў — праўда, дзяўчынак тая навука абыходзіць.

**Сяргей Мікулевіч**

# кропачкамі»

зацыя, а сьведчаньне невысокай культуры».

Гісторык Вольга Бабкова сьведчыць, што ў старых беларускіх дакумэнтах не сустракала чагосьці блізкага да сучаснай нецэнзурнай лексыкі: «Я чытаю судовыя кнігі XVI—XVII ст., дзе часта перадаюць даслоўна, што адзін скаржнік сказаў другому. Абразьлівыя выразы сустракаюцца, але за ўвесь час я сустрэла толькі адзін выпадак, калі адзін з скаржнікаў *«у матку лаяў»* другога».

Старшыня Саюзу пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч ставіцца да ўжываньня лаянкі патрыятычна: «У мастацкіх творах нецэнзурная лексыка дапушчальная, але толькі нашая, беларуская. Ня трэба нам ніякіх цюркізмаў, у беларускай мове досыць сваіх словаў, часам нават і вельмі нецэнзурных».

Яшчэ больш радыкальна настроены паэт Рыгор Барадулін, аўтар кнігі салёных жарцікаў «Здубавецьце»: «Няма ў мове пахабных словаў. Усё залежыць не ад слова, а ад чалавека, ад чысьціні яго душы. Калі слова натуральна кладзецца, калі яно вымаўленае чыстымі вуснамі, дык і не выклікае мярзотнасьці. У несаветызаваных сялянаў усё было: як гавораць у народзе, у любым родзе — і курва, і злодзей. Слова, нават цалкам «фалічнае», у чыстых вуснах і гучыць чыста. У нас на Полаччыне шмат захавалася такіх «фалічных» словаў, бо там багата захавалася паганства. Дый клімат у нас халаднейшы, таму жарснай папеўкай грэліся — тое, што па-цяперашняму называецца стымулятарам».

Г.Бураўкін на кнігу «Здубавецьце» адгукаецца стрымана: «Гэта ж не барадулінскі твор, а тое, што ён калісьці пачуў у сябе на Вушаччыне, а потым занатаваў. Дый сам Рыгор ужывае ў сваіх вершах зусім іншыя словы. Я думаю, што ў гісторыі ён застанецца зусім ня гэтай кнігай».

## Лаянку — у начны этэр

«У таго ж Даўлатава ці Глёбуса слова ня выкінеш. Але калі такое дазволіць у прэсе… У нас і так ня самы лепшы культурны стан грамадзтва», — лічыць кіраўнік Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага ўпраўленьня Міністэрства інфармацыі Ўладзімер Матусевіч. Зрэдку СМІ атрымліваюць ад Міністэрства папярэджаньні за ўжываньне ненарматыўнай лексыкі. Колькі гадоў таму чыноўнікі аддавалі на экспэртызу ў Інстытут мовазнаўства нумар «Arche» «Паталёгіі грамадзтва», дзе было багата нецэнзурных выразаў. Лаянка — сапраўды паталёгія. Менш даўняя (некалькі месяцаў) гісторыя — з папярэджаньнем «Московскому комсомольцу в Белоруссии»: газэта зьмясьціла карыкатуру з выяўным мацюканьнем. Начальнік аддзелу рэгістрацыі й ліцэнзаваньня Галоўнага прававога ўпраўленьня Міністэрства інфармацыі Віктар Гурэцкі зазначыў, што цяпер гэтае ведамства мае прэтэнзіі да газэты «Навінкі» за пастаяннае ўжываньне мату.

Н.Гілевіч згодны з тым, што з ужываньнем нецэнзурнай лексыкі трэба змагацца, але разумна: «Забаронены плод салодкі. Патрэбныя супольныя намаганьні дзяржавы і грамадзкасьці ў гэтай сфэры. Калі 12—13-гадовыя «дзевачкі» ідуць па вуліцы і сыплюць бруднымі мацюкамі, што ж тут прыгожага? Бо сёньня матамі крыюць у 12—13 гадоў, а заўтра будуць у 7—8? Трэба забараніць ужываць нецэнзурную лексыку ў кінафільмах, спэктаклях».

Тэатральны рэжысэр Мікалай Пінігін — які, апроч «Тутэйшых» і «Ідыліі», паставіў яшчэ й плойму спэктакляў з «вульгарнымі» словамі, — за дыфэрэнцыяваны падыход: «Калі аўтар пісаў дзеля смакаваньня нецэнзуршчыны — гэта адно, а калі гэткіх словаў вымагае сам твор — гэта іншае. Але гэта заўжды мусіць вырашаць сам аўтар, а ня нейкі чыноўнік».

«Я й сам ужываю ў творах словы кшталту «засранка», «курва»: яны ж ёсьць у нашай мове. Але я катэгарычна супраць нецэнзурнай лексыкі на ТВ. Людзі разумеюць так: калі гэткімі словамі можна размаўляць на экране, дык у жыцьці — і пагатоў», — перасьцерагае актор і бард Віктар Шалкевіч.

Перакладчык твораў Ірвіна Ўэлша на беларускую мову Аляксей Знаткевіч раіць не выкідаць зусім нецэнзуршчыны з мэдыяў, але максымальна абараніць тых, хто чуць яе не жадае: «Наконт спэктаклю з лаянкай мусіць быць папярэджаньне, а тэлепраграмы мусяць ісьці ў начны час». Сп.Аляксей зьвяртае ўвагу на ўмоўнасьць паняткаў вульгарнасьці й нецэнзурнасьці: «Тое, што аднаму нецэнзуршына, іншаму — вульгарызм. У Беларусі, наколькі я ведаю, гэта ня вызначана юрыдычна. У Злучаных Штатах у свой час Вярхоўны суд вызначыў восем нецэнзурных словаў і прынцыпы забароны на ўжываньне. Але ў ангельскамоўных краінах за апошнія дзесяцігодзьдзі стаўленьне да нецэнзуршчыны зьмякчылася — найперш праз паўсюдны ўжытак у кіно». Самому перакладчыку давялося вырашаць для сябе праблему ўжываньня мацернае лексыкі падчас працы з творамі шатляндзкага празаіка Ірвіна Ўэлша: «Праз мат-перамат прамаўляюць тыя героі Ўэлша, чые прататыпы менавіта так і гутараць — і не таму, што яны Ўэлша чыталі. У нас таксама некаторыя бацькі матам размаўлялі зь дзецьмі яшчэ да зьяўленьня нецэнзуршчыны ў легальнай літаратуры».

Лягічна: літаратура, тэатар, кіно нясуць сваю долю адказнасьці за ўжываньне нецэнзурнае лексыкі. Але яны толькі адлюстроўваюць стан, які склаўся ў грамадзтве.

**Аркадзь Шанскі**

# Проста словаў не стае…

**Ужываньне нецэнзурнай лексыкі не залежыць ні ад веку, ні ад адукацыйнага ўзроўню, ні ад партыйнай прыналежнасьці. Кожны робіць выбар самастойна. Таму «НН» і вырашыла правесьці апытаньне на тэму: «Ці ўжываеце вы нецэнзурную лексыку?»**

**Лілія Коваль**, віцэ-прэзыдэнтка Менскага сталічнага саюзу прадпрымальнікаў: Ні ў якім разе не ўжываю сама і не ўхваляю ў сваім атачэньні. У нас дастаткова прыгожых словаў, каб выказаць свае думкі.

**Тацяна Сапач, паэтка:** Не ўжываю. Хаця ў пераходным ад дзяцінства пэрыядзе (недзе клясе ў 6-й) карысталася.

**Павал Севярынец**, лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту»: Не, але ў дзяцінстве (у 3-й і 4-й клясе) карыстаўся досыць актыўна. Потым перастаў. Мяне вельмі дзівіць, што сёньня ў нацыянальным руху лічыцца шыкам мацюкнуцца. Пытаешся ў людзей: «Чаму?» Адказваюць: «Калі ўжо па-расейску, дык толькі матам».

**Ігар Катляроў**, дэпутат палаты прадстаўнікоў: Не карыстаюся і ніколі не карыстаўся.

**Сяргей Калякін**, лідэр Партыі камуністаў беларускай: Скрайне рэдка і толькі ў экстрэмальных сытуацыях — калі простай мовы, каб выказаць свае эмоцыі, недастаткова.

**Генадзь Фядыніч**, лідэр Беларускага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці: На працы — не, гэта выключана. Ужываю хіба што ў кампаніі зь сябрамі, дый тое вельмі рэдка — мо раз на месяц.

**Віктар Шалкевіч**, актор і бард: З найвялікшай прыемнасьцю, толькі — у адпаведных месцах і з адпаведнымі людзьмі. Бывае такі стан духу, што варта ўжыць адно, ці другое, ці трэцяе слова. Аднойчы я ляцеў у Нямеччыну і перад палётам купіў дзьве бутэлькі страшэнна дарагой беларускай гарэлкі «Ўсяслаў Чарадзей». Ішоў зь імі па вуліцы і ўпаў. Але нейкім чынам я ўпаў так, што яны ў мяне не пабіліся. І вось, устаючы, я сказаў слова, якое акрэсьлівала мой душэўны стан на той час. А што каб я іх разьбіў!..

**Апытваў АШ**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Сьваточны

**«Палац». Aist music, 2003**




«Палац» — адзіны ў Беларусі гурт, які рэгулярна выдае зборнікі найлепшых песень. Гэты — трэці за апошнія тры гады. «Сьваточны» дэманструе нам «Палац» сёньняшні — з актыўным выкарыстаньнем гітары, меней танцавальны, чым у пэрыяд «фольк-мадэрну». Аснова гэтай праграмы — апошні альбом гурту «Чужыя дзеўкі», так і не адзначаны на сёлетняй «Рок-каранацыі». Варта згадаць і шыкоўную баляду «Вецер» (яе Хаменка прысьвяціў Стэфаніі Станюце), і ды-джэйскі рэмікс на «Ночы». «Сьваточны» слухаецца на адным дыханьні, пры тым што песьні адмыслова для яго не перазапісваліся. Ёсьць на «Сьваточным» і колькі новых песень. Адна зь іх — «У лузе» — мае шанец стаць новым гітом «Палацу» (яна, дарэчы, будзе гучаць у фільме «Настасься Слуцкая»).

## Блюз у канцы тунэлю

**«Плян». Плян, 2003**




Гэты альбом, як і мэталёвая кампіляцыя БМА, яшчэ раз падкрэсьліў тэндэнцыю ў беларускай музыцы: расейска- і ангельскамоўныя каманды пасупова пераходзяць на мову беларускую. І ня толькі моладзь. Кулінковіч, які болей за дзесяць гадоў сьпяваў па-расейску, выдае беларускамоўную праграму; барды Вайханскія засьпявалі на роднай мове ажно пасьля дваццаці гадоў творчасьці, а Андрэй Плесанаў — стваральнік гурту «Плян» — ішоў да гэтага тры дзесяцігодзьдзі. «А вось захацелася сьпяваць па-беларуску цяпер», — кажа ён.

Надарылася магчымасьць паслухаць клясычны блюз і рок-н-рол па-беларуску ў выкананьні музыкаў-прафэсіяналаў. Плесанаў разам з Старыкавым ды Вугольнікам — пачынальнікі рок-н-ролу ў Беларусі. Першы нават пайграў колькі часу ў «Лявонах» (тых, якія ў 69-м сталіся «Песьнярамі»). Басіст «Пляну» Андрэй Стацэнка гадоў з 20 граў у «Харошках», гітарыст Георгі Станкевіч і бубнач Андрэй Сапоненка вядомыя кожнаму, хто цікавіцца беларускай музыкай. Акрамя стандартнага набору, у песьнях можна пачуць яшчэ зь дзясятак розных інструмэнтаў — ад звычайнага гармоніка да дарбука. На бонгах у кампазыцыі «Цені гісторыі» падыграў нават гукарэжысэр Генадзь Сыракваш.

Музыка «Пляну» каранямі ў 50—60-х — у клясычных рок-н-ролах Хейлі, Бэры, Элвіса. Большасьць тэкстаў для альбому напісаў паэт Андрэй Бурсаў.

## Hard life Heavy Music – II

**розныя выканаўцы. БМА-group, 2003**

На 18 мэталёвых гуртоў, прадстаўленых у зборніку, можа, толькі «Soncavarot» з Бабруйску ды «Straight Land» з Барысава — новыя імёны, невядомыя мэляманам. Залішняя стылёвая стракатасьць зборніка можа камусьці падацца цікавай, але за адзін раз яго праслухаць даволі складана: нібы стома ахутвае пасьля гэткіх шматразовых пад'ёмаў і спадаў. Калі казаць пра пад'ёмы — адразу чапляе «Айчына», песьня ад «Vicious Crusade». Выклікае цікавасьць мэталёвая інтэрпрэтацыя багдановічавай «Пагоні» ад гурту «Apocryphal». На «запазычаньне» наважылася і «Арызона», якая ўзяла песьню «Мроі» «Я рок-музыкант». Дарэчы, лідэр гуртоў «Vir» і «Aquamorta» Павал Ярмак выявіўся калектыўным паэтам — акрамя тэкстаў для сваіх гуртоў ён напісаў словы яшчэ для «Vicious Crusade» і «Gloom Art». Сярод гітоў і «Заход сонца» ад дэбютантаў «Soncavarot» — дзіўнавата-цудоўная трэшавая баляда з флейтай, і «Парай дарогу» — сьвежая песьня ад «Partyzone», якая розьніцца ў лепшы бок ад чутага на першым альбоме каманды.




## Архаічныя абрадавыя сьпевы

**«Гуда». GUDA, 2003**




«Гусьці», паводле Янкі Станкевіча, — значыць выдаваць доўгія працяглыя нізкія гукі. А палітоўску «Guda» значыць «Беларусь». Гурт «Гуда» складаецца з шасьці дзяўчат. Гэты калектыў хутка здабывае папулярнасьць — таму паспрыяў і шэраг канцэртаў, і ўдзел у трыб'юце «Personal Depeche». Асноўная адметнасьць першага дыску «Гуды» — захаваньне цалкам народнай манеры пяяньня. Усе 26 нумароў праграмы выконваюцца акапэльна, без інструмэнтаў, з выкарыстаньнем адпаведных прыёмаў: уменьня працяжна весьці голасам, расьпеўкі, доўгіх і кароткіх воклічаў у пэўных месцах.

У аснове праграмы — каляндарна-абрадавыя песьні (веснавыя, валачобныя, юраўскія). Самі сьпявачкі гавораць, што частку гэтых песень ужо не сустрэнеш у жывым бытаваньні — адноўлены яны былі з нотных запісаў. Песьні ў праграме не раскіданыя абыяк — яны йдуць паводле старадаўняга календару. Пачынаецца альбом з прысьвячэньня і гуканьня вясны (раней Новы год спраўлялі 1 сакавіка), сканчаецца калянднымі сьпевамі.

**Сяргей Будкін**

# «Партызаны»

**5—17 траўня ў францускім горадзе Клермон-Фэран у межах фэстывалю «Ў чаканьні Беларусі» адбылася выстава сучаснага беларускага мастацтва.**

**Назву фэстывалю адзін зь яго арганізатараў Бруно Бусаголь наўпрост зьвязаў з бэкетаўскай п’есай «У чаканьні Гадо».**

**Замест Гадо ў Клермон-Фэран прыехалі беларускія мастакі й філёзафы. Так што ў тлумачэньнях канцэпту выставы «пАРТызан» і таго, што азначае сучаснае беларускае мастацтва, дэфіцыту не было. Сутнасьць справы, аднак, не ў тлумачэньнях.**

**З Брусэлю ў Клермон-Фэран прыехаў бацька «Лёгкага партызанскага руху» Ігар Цішын. Сваімі працамі да выставы далучыліся таксама Ігар Ермакоў з Бэрліна, Натальля Залозная з Брусэлю і Мікола Паўлоўскі з Парыжу. Астатнія ўдзельнікі выставы — мастакі зь Беларусі: Сяргей Кажамякін, Ігар Саўчанка, Артур Клінаў, Аляксандар Родзін, Андрэй Вераб’ёў, Яўген Шунейка, Дзяніс Сінюгін, Андрэй Савіцкі, Ганна Сакалова і Аляксей Церахаў.**

**Месьцілася выстава на трох паверхах прыватнай галерэі сучаснага мастацтва «Garde a vue», будынак якой у даўнія часы быў бойняй.**

**На адкрыцьці выставы публіка запоўніла самую вялікую залю галерэі і не разыходзілася да поўначы. А ў перасоўнай партызанскай краме (праект Артура Клінава) увогуле было немагчыма праціснуцца. Свае ўражаньні ад выставы некаторыя гледачы былі ня супраць падмацаваць кілішкам сапраўднай лясной гарэлкі і кавалкам салёнага беларускага гурка. У гэтай частцы выстава аказалася цалкам пасьпяховым камэрцыйным праектам.**

**Камэрцыйны посьпех доўжыўся, праўда, толькі адзін дзень. Затое ў наступныя дні пачалі зьяўляцца тэлежурналісты. Праз некалькі дзён выйшла перадача нацыянальнага францускага каналу «France-3», прысьвечаная выставе.**

**У інтэрвію рэгіянальнаму тэлебачаньню «Авэрні» дырэктар і ўладальнік галерэі сп.Ален Бэйса сказаў, што выстава «пАРТызан» — гэта эстэтычная правакацыя міжнароднага ўзроўню.**

**Андрэй Вераб’ёў**



**На фота: у перасоўнай партызанскай краме (зьлева направа) Яўген Шунейка, Сяргей Кажамякін, Артур Клінаў, Валянцін Акудовіч, Алесь Анціпенка.**

Для той інтэлектуальна-эстэтычнай лучнасьці, што мы тут прадстаўляем, «партызан» — гэта адначасна і канцэптуальная мэтафара, і канцэптуальны пэрсанаж. «Партызан» ці не найлепей адлюстроўвае нейкую анталягічную сутнасьць беларуса, як у яго прыватным жыцьці, так і ў яго пражываньні гісторыі.

**Валянцін Акудовіч, філёзаф**




# У чаканьні Беларусі

Два артысты ў квяцістых трусах вітаюць гледачоў. Гэта не тэлевізійныя комікі, гэта беларускія акторы, выдатныя Сяргей Журавель і Віктар Манаеў. У клермонскім Тэатры опэры яны толькі што скончылі грацы «Стрыптыз» паводле п’есы Славаміра Мрожака. Гэтую п’есу вельмі дарэчы паставіў у Менску рэжысэр Мікола Пінігін: нябачная рука, распранаючы абедзьвюх асобаў, пазбаўляе іх свабоды.

Убачыўшы гледачоў, што засталіся пасьля спэктаклю, каб узяць удзел у дыскусіі, Пінігін зьдзіўляецца: «Што вас прымусіла застацца?». Нішто, адно цікаўнасьць. А што насамрэч мы ведаем пра Беларусь, былую савецкую рэспубліку, гэтую краіну «нідзе», што існуе ў цэнтры Эўропы?

Гадзінай пазьней, адправіўшыся ў галерэю «Garde a vue», даведваемся крыху больш. Фольк-рокавая група «Палац» дае тут канцэрт. Яна грае на фоне вялізнай фігуры чалавека, які выцягвае зь сябе ўласную галаву. Гэта твор Аляксандра Родзіна, які разам з андэрграўндавай групай «пАРТызан» выстаўляецца ў «Garde a vue». З аднаго боку — Гітлер і Сталін, а з другога — Малевіч і Шагал. Глядач адкрывае для сябе тут «Фантомныя пачуцьці» фотамастака Сяргея Кажамякіна ці «Натурморт» скульптара Андрэя Вераб’ёва — скібка хлеба з двума скрылёчкамі кілбасы і запарнікам для гарбаты, зробленымі з бэтону і гліны. Яўген Шунейка і Андрэй Вераб’ёў прапануюць інсталяцыю «Няхай жыве дэмакратыя» — мініятурную гільятыну і пяць кошыкаў з адцятымі галовамі, зь якіх выцякае кроў-атрамант; адна з галоваў ня мае твару.

Бруно Бусаголь і Віржынія Шыманец, арганізатары, выглядаюць стомленымі, але задаволенымі. Усё пачалося з тэлефоннага званку, які прагучаў у Сартрувілі неўзабаве пасьля таго, як была абвешчана беларуская незалежнасьць. Старая жанчына ўзяла слухаўку. На другім канцы — яе сястра, якая засталася ў Беларусі. Яны не размаўлялі адна з адной вось ужо 50 гадоў. А яшчэ крыху пазьней жанчына з Сартрувілю памрэ і пакіне ў спадчыну сваёй унучцы, Віржыніі Шыманец, тугу па краіне азёраў, бярозаў і лісіц. Разам з бацькам Віржынія паедзе туды ў 1992 г. і пабачыць там толькі нэндзу. Не прымаючы «вобразу Беларусі, які склаўся ў Францыі», яна ў 1996 г. стварае часопіс «Беларускія пэрспэктывы» і працуе над дысэртацыяй, прысьвечанай беларускаму тэатру. У 1999 г. — другое тэлефанаваньне, якое мае правідэнцыйны сэнс, гэтым разам тэлефанаваньне ў часопіс. На другім канцы — Бруно Бусаголь. Ён толькі што прачытаў «Чарнобыльскую малітву» Сьвятланы Алексіевіч, трывожныя галасы Чарнобылю. Ён хоча перанесьці гэтыя галасы ў тэатар і хоча ведаць больш пра Беларусь.

У красавіку 2002 г. Бруно Бусаголь разам зь беларускімі артыстамі ставіць «Малітву». Гэты спэктакль ёсьць у праграме, але акторы не прыяжджаюць. Трупе «параілі» паўдзельнічаць у другім фэстывалі ў Гомелі, горадзе, які — іронія лёсу — зьяўляецца пабрацімам Клермон-Фэрана. Чакалі таксама Галіну Бандажэўскую, жонку дасьледчыка Юр’я Бандажэўскага, які знаходзіцца ў вязьніцы ў Менску. З прычыны пагрозаў ейнай дачцэ яна таксама не прыехала.

**«Liberation», 12 траўня.**
**З францускай пераклаў**
**Юрась Барысевіч**






**Сьпявае «Палац»**

# ў К.-Фэране

## Маніфэст выставы

Беларусь — краіна невыразных цывілізацыйных формаў і мінімалісцкіх сродкаў выжываньня. Гэта прастора «Х», якая сёньня не пазначана вонкавымі знакамі, што ўвідавочваюць яе эўрапейскую мінуўшчыну. Традыцыя ня ёсьць тут чыньнікам стабільнасьці і раўнавагі. Традыцыя паўстае як супраціў, а мастацтва і творчасьць — як учынак.

Беларусь — гэта прастора экспэрымэнтаў, небясьпекі і неспакою, гэта прастора, якая нараджае асобаў і творцаў ды выштурхоўвае іх па-за свае межы: М.Шагал, К.Малевіч, Э.Лісіцкі, Г.Апалінэр, Х.Суцін, У.Страмінскі й іншыя.

Гэта прастора, якая ніколі ня мела ўстойлівых межаў, а таму яе заўсёды можна было пакінуць, каб не вярнуцца. Але насамрэч яе пакідалі, каб вяртацца праз стагодзьдзі ці дзесяцігодзьдзі забыцьця.

90-я гады мінулага стагодзьдзя ў Беларусі характарызуюцца двума выразнымі фэномэнамі — паўстаньнем беларускага інтэлектуалізму, рэпрэзэнтаванага корпусам арыгінальных філязофскіх і культуралягічных тэкстаў, і неафіцыйнага сучаснага беларускага мастацтва, рэпрэзэнтаванага творчасьцю каля двух дзясяткаў мастакоў, якія жывуць сёньня ня толькі ў Беларусі, але й па-за яе межамі.

Гэта мастацтва нераўнавагі, неспакою, выразнага ці прыхаванага дзеяньня й супраціву. Яго вытокі палягаюць у памежнай сытуацыі канца XX ст., часу радыкальнай зьмены мастацкае, ідэалягічнае й мэнтальнае парадыгмаў беларускага грамадзтва й набыцьця беларускай незалежнасьці. Другім важным элемэнтам гэтага фэномэну зьяўляецца мастацкае экспэрымэнтаваньне на тле традыцыі авангарднага беларускага мастацтва 1920-х гадоў (М.Шагал, К.Малевіч, Э.Лісіцкі, В.Кандзінскі ды інш.) і мастацкіх працаў, што адбываюцца ў сучасным эўрапейскім кантэксьце.

З усталяваньнем аўтарытарнага рэжыму ў Беларусі, частка мастакоў, што належаць да гэтае плыні, зьяжджаюць. А творчасьць тых, што застаюцца ў краіне, выразна эвалюцыянуе ў напрамку мастацтва дзеяньня (пэрформансу), якое даволі часта ўтрымлівае ў сабе элемэнт мастацкай вобразнай і інтэлектуальнай іроніі й гратэску. Элемэнты мастацкага пэрформансу прасочваюцца і ў тых мастацкіх формах (творах), якія можна назваць традыцыйна недынамічнымі формамі мастацкае творчасьці. У сучасным беларускім кантэксьце творчасьць гэтых мастакоў успрымаецца як мастацтва «Іншага». Разам з тым у эўрапейскім кантэксьце гэта выразна сучаснае мастацтва, якое ўтрымлівае ў сабе пошукі новай беларускай культурніцкай і мастакоўскай ідэнтычнасьці.

**Алесь Анціпенка, куратар выставы**



Ігар Саўчанка. «Карціна ў яго за сьпінай».



Віржынія Шыманец, аўтарка канцэпцыі Беларускіх дзён, тэатразнаўца, выкладчыца ўнівэрсытэту Парыж-IV.



Ігар Цішын. Фота з праекту «Малы партызанскі рух».



Андрэй Вераб'ёў. «Маска на штодзень».



Бруно Бусаголь




На выставе (зьверху). У Клермон-Фэране ёсьць свая «Пагоня».




Артур Клінаў. «Happy new Millenium».

**Дзіўны чалавек Бруно Бусаголь. Навошта яму Беларусь?! Фэстываль, які ён арганізаваў разам зь Віржыніяй Шыманец, нягледзячы на посьпех у Францыі, важны перадусім для нас.**

**Бруно сам растлумачыў, дзеля чаго ён займаўся фэстывалем, у якім бралі ўдзел больш за пяцьдзясят беларускіх артыстаў, мастакоў і інтэлектуалаў: «Я перакананы, што «нешта», яшчэ неўсьвядомленае, але што тычыцца нашай супольнай будучыні, фармуецца цяпер у Беларусі». Бруно Бусаголь — тэатральны рэжысэр, чалавек, прафэсія якога вымагае інтуіцыі і адчуваньня пэрспэктывы.**

Артур Клінаў



## «Нешта, яшчэ неўсьвядомленае, што тычыцца будучыні Эўропы, фармуецца цяпер у Беларусі»

## • ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

### ВІТАНЬНІ

**Віктара Шляхціна**, кіраўніка Віцебскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ, з Днём народзінаў! Шчасьця, натхненьня, посьпехаў! Тацяна

**Дзякуй, Люстэрка** маё, за твой сонечны зайчык, што даскочыў да мяне. Зьзяй і надалей! Тваё сонейка

**Віншуем** усіх беларусаў, што пачуваюць сябе эўрапейцамі, з Днём Эўропы! Годнасьці і мужнасьці вам!

### КАНТАКТЫ

**Шукаем пэнсіянэрку**, якая пагадзілася б пажыць летам на нашай дачы з нашым хлопчыкам (12 гадоў). Т.: 259-72-20

**Запрашаем** на экзатычны адпачынак у міжнародны археалягічны летнік «Палатыда» летам! E-mail: palatida@mail.ru. Т.: 8-029-646-90-99

**Набуду** які-кольвек збор малюнкаў Н.Орды. Т.: 237-37-25

**Бацькі**, якія хочуць павесьці сваіх дзяцей у беларускамоўную пачатковую клясу, тэлефануйце. Т.: 288-23-52 (з 12.00 да 18.00), 288-68-91 (Ігар), 215-84-09 (Алесь, пасьля 20.00)

**Прадам** «Народны альбом». Т. (у Магілёве): 45-54-50

**Наваградзкае таварыства філяматаў** прымае заявы на правядзеньне экскурсіяў па Наваградчыне. Па дадатковую інфармацыю зьвяртацца да Тацяны Царук па т.: (01597) 23-8-09

**Zbsb.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Наведайце

### ПРАДАМ

**«Кнігі — поштай» — новае:** Уладзімер Арлоў «Ордэн Белай Мышы». Замаўляйце — праз пошту: а/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by; праз Internet: http://exlibris.cjb.net; праз тэлефон: 8-029-643-57-33

**Прадам рубэройд**, цэмэнт, сумесі «Люкс», «Зорніца», фарбы «Олі-Бела». Т.: 224-75-21, 756-45-78

**«Хонда Канцэрта»** 1992 г.в., толькі зь Нямеччыны. 1,6 інжэктар, ГУ, ЭАП. Т.: 8-029-620-85-56

### ПРАЦА

**Аўтасьлесар**, кіроўца катэгорыі В, трактарыст шукае працу. Т.: (01773) 6-44-43, 6-80-77

**Аўтасуправаджэньне** па Беласточчыне. Перасячэньне мяжы, дастаўка і прывоз малагабарытных грузаў. Т.: (01631) 22-7-78

**Выкладчык фізыкі** з досьведам выкладаньня на падвышаным узроўні шукае працу ў беларускамоўнай школе. Т.: 263-70-69

**Беларускамоўная жанчына** (40 год, сярэдняя спэцыяльная пэдагагічная адукацыя) шукае працу. Т.: 254-05-58

**Пэдагогі**, мэдработнікі, праца для вас. За сумленную працу — добры заробак. Т.: 230-59-13 (з 12.00 да 17.00), 207-00-00, аб.20819

## Новы «Дзеяслоў»

У чацьвер, **22 траўня**, у Вялікай залі Дому літаратара (вул.Фрунзэ, 5) адбудзецца літаратурна-музычная вечарына-прэзэнтацыя новага часопісу «Дзеяслоў».

У вечарыне возьмуць удзел Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Леанід Дранько-Майсюк, Міхась Скобла, Галіна Булыка, Андрэй Хадановіч, Алесь Камоцкі, Эдуард Акулін і іншыя вядомыя беларускія паэты і барды.
Пачатак а 18-й. Уваход вольны

**27 траўня** а 18-й па адрасе вул.Славінскага, 1/3 адбудзецца сустрэча з аўтарамі часопісу «Дзеяслоў».

## ДЗІВОСЫ

### Чынгачгук — Белы Арол

Мяжу зь Беларусяй, Украінай і Расеяй польскія пamежнікі будуць ахоўваць па індзейскіх мэтодыках. Вучыць іх прыедуць індзейцы, што працуюць у мытнай службе Арызоны і спэцыялізуюцца на пошуках кантрабандыстаў. Паляці навучацца шукаць сьляды па зрушаных камянях і паламаных галінках. Злоўленых парушальнікаў скальпаваць ня будуць.

**СМ**

## ЦЫТАТА ТЫДНЯ

Я не прайду міма, калі нешта таленавітае, прабачце, будзе валяцца пад нагамі. Я ніколі міма не прайду. Я абавязкова падыму.

**А.Лукашэнка падчас сустрэчы з студэнтамі Акадэміі мастацтваў**

# Крыжаванка



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 9.** Нешта незвычайнае, што быццам бы супярэчыць разумнаму сэнсу, але тым ня менш існуе. **10.** «… — гэта кветачкі-пралескі. Крый нас, Божа, калі гэта толькі кветкі». **11.** У нядаўнім мінулым — розум, гонар і сумленьне эпохі. **12.** Тое, чаго, на думку некаторых багасловаў, не было ў Адама і Эвы. **13.** Хімічнае злучэньне вадароду зь іншым элемэнтам. **14.** Месца, дзе, як правіла, можна культурна адпачыць. **15.** Голас, сярэдні паміж тэнарам і басам. **17.** На думку ці то Леніна, ці то Луначарскага, найважнейшае з усіх мастацтваў. **18.** Яго часта выкарыстоўваюць супраць молі. **20.** Чалавек, якому мора па калена, але ня п'яніца. **22.** Электрон са знакам плюс. **25.** Беларуская кампазытарка, аўтарка сымфанічнай паэмы «Бандароўна». **27.** Элегантнасьць на францускі манер. **29.** Увесь сьвет, бясконцы ў часе і прасторы. **30.** Грашовы збор на ўвоз ці вываз тавару. **31.** Дзяржава ў Афрыцы, якой кіруе Ёвэры Мусэвэні. **33.** «Матчын ...» Алеся Гаруна. **34.** Прадукцыя мазырскай нафтаперапрацоўкі. **35.** «Бяры там невад з рыбакамі, Паноў парадуй шчупакамі: Галодны, можа, небаракі, А мо абрыдлі ім …». **36.** Навука аб прыгожым.

**ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1.** Інфармацыйная праграма на Беларускім тэлебачаньні. **2.** Аповесьць Івана Пташнікава. **3.** «Наша…», але ня ніва. **4.** Ацэтылсаліцылавая кіслата. **5.** Адзін з атрыбутаў манарха. **6.** Частка плоскасьці, абмежаваная акружнасьцю. **7.** Маленькая талерка з закругленымі берагамі. **8.** Атрутнае рэчыва расьліннага паходжаньня. **15.** Газэта, што выдаецца Беларуска-амэрыканскім задзіночаньнем у ЗША. **16.** Горад, у якім, паводле Эвангельля, рос Ісус Хрыстос. **19.** Раз, два, … **21.** Пры нагодзе іх выкарыстоўваюць і ў бойках. **23.** Расейскі банк, які хоча прыватызаваць «Белшыну». **24.** Крывавы наркам і сам ахвяра. **25.** Даўней: выхавальнік дзяцей у сям'і, звычайна іншаземец. **26.** Узрост віна. **28.** Лінза зь дзьвюма сфэрычнымі паверхнямі, якія маюць аднолькавы напрамак крывізны. **30.** Мэталічны грашовы знак. **32.** Паліва для печы. **34.** Грэцкая літара.

**Сяргей Петрыкевіч**

Шчыра спачуваем Ганьне Суднік у сувязі зь сьмерцю бабулі. Няхай зямля ёй будзе пухам.

**Нашаніўцы**

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Беларусы: Т.6. Грамадзкія традыцыі**. — Менск: Беларуская навука, 2002. — 606 с.: іл.

Шосты том з цыклу «Беларусы» прысьвечаны традыцыям супольнай працы й адпачынку. Аб'ектам аналізу ў кнізе сталі такія грамадзкія фэномэны, як талака, сялянская грамада, звычаёвае права, рамесныя цэхі, праваслаўныя брацтвы, гарадзкое самакіраваньне ды інш. Цана выданьня ў «Акадэмкнізе» — блізу 10 тыс. рублёў.

**Булгарын Ф. Выбранае** / Уклад., прадм., камэнт. А.Фядуты. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 592 с.: іл.

Гэты том — першае пасьмяротнае выданьне твораў Т.Булгарына на ягонай гістарычнай радзіме. Знайсьці кнігу можна ў большасьці менскіх кнігарняў.

**Галасы:** Зборнік /Уклад. Юрка Голуб. — Горадня, 2003.

У кнізе прадстаўлены творы, надрукаваныя цягам мінулага году на літаратурных старонках газэты «Гродненская правда». У кнігу ўвайшлі творы 80 аўтараў. Зборнік складаецца з чатырох разьдзелаў: «Упершыню на літаратурнай старонцы», «Вершы», «Аповеды» і «Артыкулы». Наклад — тысяча асобнікаў.

**Лазука Б. Гісторыя мастацтваў.** — 2-е выд., дапрац. — Менск: Беларусь, 2003. — 399 с.

Даведацца пра найзнакаміцейшыя мастацкія шэдэўры, прасачыць, як зьмяняліся стылі й кірункі, як разьвіваліся нацыянальныя школы розных краінаў, вылучыць найважнейшыя эпохі ў гісторыі сусьветнага мастацтва ад старажытнасьці й да канца XVIII ст. дапаможа гэтая добра ілюстраваная кніга. Аўтар надаў вялікую ўвагу й мастацкай спадчыне беларусаў. Для тых, хто толькі пачынае вывучэньне гісторыі сусьветнага мастацтва, у выданьні зьмяшчаецца слоўнік тэрмінаў ды спэцыяльных паняткаў. Цана кнігі ў «Цэнтральнай кнігарні» немалая — амаль 19 тыс. рублёў.

**Казько В. Суд у Слабадзе:** Аповесьць. — Менск: Сталія, 2003. — 192 с.

Перавыданьне аповесьці «Суд у Слабадзе» В.Казько, вядомай яшчэ й дзякуючы зьнятаму паводле яе мастацкаму фільму, вяртае нас у пасьляваенныя гады. Праз лёс выхаванцаў дзіцячага дому, якія падчас вайны былі донарамі для нямецкіх салдатаў, аўтар паказвае, колькі бязьвінных ахвяраў забрала другая сусьветная нават па сваім заканчэньні. Цана ў «Кнігарні пісьменьніка» — 1800 руб.

**Праваслаўныя манастыры Беларусі = Orthodox Convents and Monasteries of Belarus** / Аўт.-склад. С.Сомаў. — Менск: Чатыры чвэрці, 2003. — 200 с.: іл. — (Нашы духоўныя каштоўнасьці; Вып. 5)

Кніга ўвабрала ў сябе апісаньне й гісторыю (у форме ці то кароткіх зьвестак, ці то аб'ёмістых папулярна напісаных нарысаў) 127 праваслаўных манастыроў, якія існавалі або існуюць на беларускіх землях пачынаючы ад XII ст. Асаблівую мастацкую вартасьць выданьню надаюць выкарыстаныя тут працы А.Кашкурэвіча, А.Марачкіна, У.Басалыгі ды іншых беларускіх мастакоў. У «Кнігарні пісьменьніка» том каштуе каля 25 тыс. рублёў.




**Пам'ятки України: історія та культура:** Науковий часопис. — 2002. — № 3—4.

Нумар цалкам прысьвечаны берасьцейскаму Палесьсю. Увага зьвернутая на крытэры разьмежаваньня беларускай ды ўкраінскай спадчыны. Аўтары ўздымаюць лінгвістычныя, геапалітычныя, гістарычныя, мастацтвазнаўчыя аспэкты суіснаваньня дзьвюх сумежных культураў. Не абыдзенае і «яцьвяскае» пытаньне: у нумары друкуецца матэрыял А.Рыбалкі «Яцьвяская мова»: да й пасьля». Беларускі бок прадстаўлены аўтарамі берасьцейскага паходжаньня.

**Бюджет столичного города** / Менскі НДІ сац.-эканам. і паліт. праблем; В.Бабкоў, А.Лучанок, А.Шулейка і інш. — Менск, 2003. — 294 с.

Аўтары прааналізавалі станоўчыя моманты й пралікі ў функцыяваньні менскага бюджэту за апошнія гады, скарысталі для параўнаньня замежны матэрыял ды далі канкрэтныя парады па аптымізацыі фармаваньня й выкарыстаньня сталічнага бюджэту. Наклад 150 ас.

**Тацяна Вабішчэвіч, Андрэй Мялешка**

## Лекцыя Найдэра

**23 траўня Польскі інстытут у Менску запрашае на публічную лекцыю.** Тэма — «Польскія пляны эўрапейскай усходняй палітыкі». Чытаць будзе прафэсар Зьдзіслаў Найдэр — у мінулым адзін зь лідэраў дэмакратычнай апазыцыі Польшчы, у камуністычнай Польшчы завочна асуджаны да сьмяротнага пакараньня. Цяпер ён прафэсар Апольскага ўнівэрсытэту, аўтарытэтны экспэрт-«міжнароднік». Паслухаць яго можна будзе на франка-беларускім факультэце ЭГУ (вул.Броўкі, 3/2, аўд.323) у 10.00 і на факультэце міжнародных адносінаў БДУ (вул.Акадэмічная, 25, аўд.303) ў 13.00.

## STUDIUM EUROPY WSCHODNIEJ UW

абвяшчае спабор на атрыманьне 25 стыпэндыяў для кандыдатаў з краін былога камуністычнага блёку. Стыпэндыі прызначаныя для 2-гадовага навучаньня ў Варшаўскім унівэрсытэце.

Удзельнікі спабору мусяць быць у веку да 30 гадоў, мець вышэйшую адукацыю (найлепш — гуманітарную), ведаць польскую, ангельскую й расейскую мовы. Таксама трэба атрымаць добры вынік па агульнадукацыйным тэсьце й сумоўі, нябблага арыентавацца ў праблематыцы Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропы, Расеі, Азіі і Каўказу.

Праграма навучаньня ўтрымлівае пытаньні па гісторыі і праблемах нацыяў, а таксама паліталёгіі. Прысутнічаюць элемэнты гісторыі мастацтва, літаратуры, культуралёгіі, сацыялёгіі, геаграфіі, дэмаграфіі, права, эканомікі. Апроч таго, стыпэндыяты будуць вучыць адну з моваў рэгіену. Заняткі праводзяць польскія й замежныя выкладнікі.

Дакумэнты на атрыманьне стыпэндыі трэба дасылаць да 1 чэрвеня 2003 г. Навучаньне пачнецца з 1 лістапада 2003 г. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць праз наступныя кантакты: Uniwersytet Warszawski, Pałac Patockich, Krakowskie Przedmieście 32, 00-325 Warszawa 64, Polska. Т. (у Варшаве): 828-80-75, 55-20-916; факс: 828-53-69; e-mail: studium@mercury.ci.uw.edu.pl, www.uw.edu.pl.

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Сяргей Ёрш
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3514.

Нумар падпісаны ў друк 21.05.2003.

Замова № 2645.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а